ЛІТАРАТУРА і мастацтва

ЛіМ

8 красавіка 2005 г. № 14/4301

АНОНС!

У кожнага чытача — свае "тэхналогіі чытання". Нехта любіць прачытаць твор "за адзін прысядак", іншы аддае перавагу чытанню расцягнутаму, удумліваму, каб пасля трох-пяці старонак паразважаць ды спраектаваць свае ўласныя прагнозы на далейшыя падзеі ў сюжэце. Вось апошнім і выдаецца цудоўная магчымасць дзеля пабудовы ўласных версій — развіцця падзей і верыфікацыі сваёй чытацкай інтуіцыі.

СТАР. 6

Чароўныя гукі старажытнага органа луналі пад скляпеннямі барочнага касцёла і заціхалі недзе ў закутках доўгай навы. На нейкі момант здавалася, што ажывалі анёлы на фрэсках, а позірк святых з абразоў рабіўся цяплейшы і па-чалавечы прыязны. Уласная істота быццам раставралася ў паветры і разам з чулай і пяшчотнай мелодыяй узнімалася ў паднябесце...

Я зазірнула ў "майстэрню чарадзея" і пагутарыла з ім — Валерыем Шматам, сталічным музыкантам, арганістам касцёла святых Сымона і Алены, мастацкім кіраўніком двух хораў і проста таленавітым чалавекам.

Ларыса ДАРАШЭНКА

СТАР. 10

Магічны крышталь

Як там у класіка, памятаеце? "Тэатр — не люстэрка, а павелічальнае шкло". Рэч у кожным разе адмысловая і крохкая. Трошку містычная. Гэткі "магічны крышталь", з дапамогай якога чыніцца на сцэне чарадзейства, ладзіцца сувязь між яго чыннікамі й гледачамі. І ці не таму кожную вясну адбываецца ў сталіцы ўрачысты рытуал уручэння менавіта крышталёвых, прыгожых, крохкіх, трошку містычных сімвалаў майстэрства і творчай адметнасці ў розных відах тэатральнага мастацтва?

Нядаўна святкавалі Міжнародны дзень тэатра. Новых лаўрэатаў імянных прэмій і ўладальнікаў крышталёвых прызоў, як вядзецца, назваў Беларускі саюз тэатральных дзеячаў. Салістка Беларускага дзяржаўнага музычнага тэатра Маргарыта Александровіч атрымала прэмію імя Л.Александроўскай, артыст-горкавец Аляксей Шадзько — прэмію імя І.Буйніцкага, у рэжысёра-купалаўца Уладзіміра Савіцкага — узнагарода імя Е.Міровіча. Павел Харланчук, акцёр і рэжысёр Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя М.Горкага, ганараваны прэміяй імя Л.Мазалеўскай. За яркія і унікальныя артыкулы, кнігі пра беларускіх артыстаў прэміяй імя К.Крапівы адзначаны тэатральны крытык, пісьменнік, у свой час і супрацоўнік "ЛіМа" Барыс Бур'ян.

А як размеркаваліся традыцыйныя зіхоткія прызы? Уладальніца "Крышталёвай Паўлінкі" сёлета — народная артыстка краіны Людміла Лаўрыновіч (Гомельскі абласны драмтэатр), "Крышталёвы анёл" усміхнуўся Юрыю Франкову, артысту тэатра "Лялька" (Віцебск) — абое на здымку "Крышталёвая зорка" заззяла для для артыста Тэатра-студыі кінаакцёра Аляксандра Кашперава. "Крышталёвая кветка" ўпрыгожыла творчую сцяжыну актрысы тэатра імя М.Горкага Аляксандры Багданавай.

Чым стаўся ў той вечар для артыстаў бляск прафесійных узнагарод? Пэўна, знакам асаблівай урачыстасці і строгай часткай дасціпнага тэатральнага капусніка — гэтага своеадметнага "магічнага крышталю" мастацтва сцэны.

Фота М. ЗАМУЛЕВІЧА

Матывы казахскія і...

Маншук Алдамжарава, жонка пасла Казахстана ў Рэспубліцы Беларусь, занялася жывапісам сур'ёзна і з вялікім захапленнем, хаця не так і даўно — таму лічыць сябе мастаком-пачаткоўцам. У яе ўжо нямала жывапісных работ, адметных пошукамі ў розных стылях. Карціны Маншук Алдамжаравай вабяць яркім каларытам, лірычнымі вобразамі, у чым пераканаліся шматлікія наведнікі яе вернісажа ў Нацыянальнай бібліятэцы РБ. Апроч самабытных казахскіх матываў у партрэтах, нацюрмортах і пейзажах, кранальнымі падаліся беларускія сюжэты: "Зубр", "Помнік Скарыну", "На рацэ Друць"... Выстаўка атрымала шматзначную назву: "Веру ў жыццё".

Я.КАРЛІМА

Фота К.Дробава

За ўвесь беларускі народ

З дня пакарання Кастуся Каліноўскага прайшло 120 год. У дзень памяці навукова-асветніцкім цэнтрам педагагічнага універсітэта імя М. Танка была праведзена вечарына і ўрачыстае адкрыццё выставы "Вечная памяць К. Каліноўскаму". Падчас імпрэзы прагучалі выступленні навукоўцаў, гісторыкаў, філосафаў, фалькларыстаў, мастакоў, кампазітараў і паэтаў.

"Кастусь Каліноўскі ўвайшоў у нашу гісторыю назаўсёды! І я лічу, што хутка гэты дзень будзе адзначаць уся нацыя, уся краіна. Бо той унёсак, які зрабіў Каліноўскі для Беларусі, для нас з вамі вельмі важны!" — зазначыў мастак Мікола Купава.

Шмат урачыстых слоў у гонар К. Каліноўскага было прамоўлена даследчыкамі Вячаславам Шалкевічам, Генадзем Кісялёвым, Уладзімірам Конанам; пісьменнікамі Сяргеем Панізнікам, Пятром Русавым і інш.

Скончылася імпрэза сімвалічна і ўзвышана: святы айцец Леанід Акаловіч адслужыў малебен як за ахвяр паўстання, так і за ўвесь беларускі народ.

Святлана КАНАНОВІЧ

Пра «Марцовых катоў»

На зыход першага месяца вясны прыпала закрыццё выставы "Марцовыя каты" ў Палацы мастацтваў. Нехта паспеў пабываць на ёй, некаму не пашчасціла трапіць туды. Але, як бы там ні было, выстава вартая таго, каб яе прыгадаць.

Наўрад ці нават самы пераборлівы наведвальнік змог бы адшукаць тут хаця б дзве падобныя адна да адной работы. У кожнага мастака кот атрымаўся свой: у Таццяны Гардашнікавай — вясёлы, а ў Ірэны Дзесюкевіч — сумны; задаволены ў Валянціна Губарэвіча

і хітраваты ў Міхала Гуліна. Але ва ўсіх творах выразна праглядалася адзіная думка: людзі і браты нашы меншыя маюць шмат агульнага. Нездарма яны такія падобныя да нас і характарам, і станам душы, а таму іх таксама трэба шанаваць.

Магчыма, каму-небудзь падалося,што тэматыка выстаўкі па-вясноваму легкадумная, але, пэўна,павандраваўшы па загадкавым свеце кошак,міжволі сам зробішся больш "мяккім і пухнатым" і абавязкова захочаш змяніцца да лепшага.

Таму вельмі сімвалічна, што добры ўчынак можна было здзейсніць, не выходзячы з выставачнай залы: дапамагчы хворым дзецям.І яшчэ адна немалаважная заўвага: атрымаўшы на выставе зарад пазітыўнай энергіі,так лёгка дарыць усмешку людзям навокал — і, хто ведае, магчыма, аднойчы свет усміхнецца табе ў адказ?

Святлана САЎКО,
вучаніца 11-га класа
Мінскай СШ № 46

Фота аўтара

Літаратурныя сувязі

Запрашэнне для ўдзелу ў першым сусветным кангрэсе перакладчыкаў польскай літаратуры атрымаў беларускі пісьменнік і перакладчык Анатоль БУТЭВІЧ. Кангрэс адбудзецца ў першай палове мая ў Ягелонскім універсітэце ў Кракаве.

Пад патранатам міністра культуры Польшчы прадстаўнічы перакладчыцкі форум праводзіць Інстытут кніжкі. Будуць абмяркоўвацца важнейшыя пытанні прамоцыі польскай літаратуры ў свеце. Адбудуцца дыскусіі, прысвечаныя творчасці польскіх пісьменнікаў — ад класікі да сучаснасці, абмен вопытам перакладчыцкай дзейнасці, абмеркаванне найноўшых тэндэнцый развіцця прыгожага пісьменства і самых апошніх польскіх выданняў прозы і паэзіі, а таксама праблемы, звязаныя з іх перакладам на замежныя мовы.

Анатоль Бутэвіч даўно займаецца перакладамі польскай літаратуры на беларускую мову. Апошнім важкім набыткам у гэтай справе стаў выхад у выдавецтве "Мастацкая літаратура" рамана Элізы Ажэшкі "Над Нёманам" у папулярнай серыі "Скарбы сусветнай літаратуры". Цяпер пісьменнік працуе над перакладам гістарычнай аповесці Рышарда Курыльчыка "Пярэдадзень славянства".

А напрыканцы мінулага года за прапаганду польскай літаратуры Анатоль Бутэвіч адзначаны ўзнагародай польскага Таварыства аўтараў ZAiKS. Да гэтага яна прысуджалася Максіму Танку і Янку Брылю.

Н.К.

Пастаўшчык выданняў

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася прэзентацыя інфармацыйных рэсурсаў кампаніі "East view publications" (ЗША). Тут былі прадстаўлены паўнатэкставыя і бібліяграфічныя базы даных кампаніі "East View PUBLICATIONS" — аднаго з вядучых пастаўшчыкоў інфармацыйных прадуктаў і паслуг з краін СНД і Балтыі, Кітая, Карэі на сусветным рынку.

Створаная ў 1989 годзе, кампанія "East View PUBLICATIONS" назапасіла вялікі вопыт абслугоўвання кліентаў ва ўсіх краінах свету. Цэнтральны офіс кампаніі знаходзіцца ў Мінеапалісе (ЗША). Яе прадстаўніцтвы ёсць у Маскве і Кіеве, супрацоўнікі — ва ўсіх буйных гарадах краін СНД.

Кампанія "East View PUBLICATIONS" з'яўляецца пастаўшчыком перыядычных выданняў, кніг і мікрафільмаў, а таксама баз даных, доступ да якіх маюць амаль усе буйнейшыя бібліятэкі свету. У апошнія гады кампанія актыўна заваёўвае пазіцыі на рынку электронных інфармацыйных рэсурсаў. Бібліяграфічныя базы даных змяшчаюць інфармацыю па грамадскіх, гуманітарных навуках, ваеннай тэматыцы.

Н.К.

Пад знакам «Вясёлкі»

Два святы супалі: Тыдзень дзіцячай кнігі і дзень нараджэння часопіса "Вясёлка". А сабраліся ўсе — вучні, настаўнікі, бібліятэкары, пісьменнікі — у Цэнтры творчасці дзяцей і моладзі "Ранак".

Вядучыя свята Тамара Патук, загадчыца мінскай дзіцячай бібліятэкі № 6, і Уладзімір Ліпскі, галоўны рэдактар часопіса "Вясёлка", па чарзе запрашалі на сцэну каралеву Кнігу, Васю Вясёлкіна і Васілінку, паэтаў Міколу Маляўку, Ніну Галіноўскую, Казіміра Камейшу, Міколу Чарняўскага, Уладзіміра Мазго, Алеся Камароўскага, мастака Яўгена Ларчанку. Весялілі дзяцей казачныя героі твораў гэтых аўтараў Антонік-Понік, Баба-Яга, кот Нелавімыш, цётка Слізготка, певень Забіяка.

Апладысментамі сустрэлі Міхаіла Ціцянкова — старшыню Камітэта па адукацыі Мінскага гарвыканкама. За падтрымку дзіцячага часопіса ён узнагароджаны вясёлкаўскім медалём Васіля Віткі.

Пад перазвон цымбалаў і меладычныя гукі баянаў доўга ліліся песні, цешылі вока і душу беларускія народныя танцы. Пастараліся харэаграфічны тэатр "Кветачка" СШ № 80 і этнаграфічны гурток СШ № 3.

А каб свята адбылося, паспрыялі адміністрацыя Маскоўскага раёна сталіцы, дырэктар Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі "Ранак" Жанна Даўлатава, калектыў дзіцячай бібліятэкі № 6.

Н.К.

Вясна з «Арт-мажорам»

"Гарачая вясна" для Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў пачалася аж 15 сакавіка. Тады ў Маладзёжным тэатры эстрады адбылося адкрыццё штогоднага фестывалю мастацтваў "Арт-мажор". Сёлета ён прысвечаны 60-годдзю Перамогі і 30-годдзю існавання універсітэта.

Як паведаміла мне кіраўнік прэс-цэнтра Ларыса Доўнар, такі фэст праходзіць з 1993 г., а сваю непаўторную назву атрымаў у 2003-м. "Арт-мажор" прадстаўляе больш як 20 высокапрафесійных творчых калектываў, неаднойчы адзначаных на міжнародных і рэспубліканскіх конкурсах у галіне народна-інструментальнага мастацтва, харэаграфіі, эстрады... Гэтым разам у яго адкрыцці ўдзельнічалі "Гуды" (капэла беларускіх народных інструментаў пад кіраўніцтвам У. Грома), "Талака" (ансамбль народнай песні пад кіраўніцтвам В. Калацэя), салістка эстрады і выпускніца БДУКіМ І. Дарафеева і інш.

"Кожны такі фестываль — гэта справаздача нашых творчых кафедраў. Студэнты падводзяць вынікі сваёй справы і паказваюць, чаму яны навучыліся. Ад таго, як яны сябе пакажуць, залежыць іх будучыня. Таму кожная кафедра заўсёды робіць новыя нумары ў сваёй праграме", — удакладніла Л. Доўнар. Дарэчы, паводле яе слоў, на ўсіх канцэртах зала поўная. Вольны ўваход, высокі ўзровень творчых калектываў — на такіх імпрэзах варта бываць!

Заключны канцэрт фестывалю "Арт-мажор", у праграму якога ўвойдуць лепшыя нумары, адбудзецца 20 мая ў Цэнтральным доме афіцэраў.

Алесь КІРЫКОВІЧ

З пашанай

У гэтым годзе рыхтуецца адзначыць свой 60-ці гадовы юбілей краязнаўца Міхась Маліноўскі — аўтар шматлікіх газетных карэспандэнцый, артыкулаў, нарысаў у галінах гісторыі, культуры, літаратуры, вайсковай справы, прыродазнаўства.

Асобная старонка дзейнасці Міхася Маліноўскага — вывучэнне беларускай літаратуры і культуры. Ён — актыўны ўдзельнік міжнародных і рэгіянальных навукова-практычных канферэнцый, а таксама разнастайных імпрэз, прысвечаных вядомым дзеячам Беларусі.

Аляксей ШАЛАХОЎСКІ

Нам засталася спадчына...

Любая дзяржава славіцца не толькі ўзроўнем развіцця эканомікі, заводамі ды буйнымі прадпрыемствамі ці палітычным укладам, а найперш культурным жыццём: пісьменнікамі і музыкантамі, мастакамі і архітэктарамі, тым, які ўнёсак у сусветную спадчыну зрабілі яе славутыя прадстаўнікі. Ні для каго не сакрэт і не адкрыццё, што спакон вякоў наша родная Беларусь была багата на таленавітых людзей ва ўсіх, без выключэння, галінах і сферах жыцця.

Вялікая работа — стварыць нешта адметнае, праславіць сваю краіну, але не менш сілаў, адданасці сваёй працы, часу і намаганняў вымагае захаванне спадчыны, памяці і звестак пра славутых сыноў і дачок айчыны.

Адным з такіх самаахвярных і адданых людзей з'яўляецца Аляксандр Прановіч. Ён — дырэктар Пухавіцкага раённага краязнаўчага музея. У другой палове сакавіка па запрашэнні Аляксандра Аляксандравіча прадстаўнікі Рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і Мастацтва" на чале з яе дырэктарам Таісай Бондар наведалі Пухавіцкі раён.

Паездка распачалася з азнаямлення з мясцовым краязнаўчым музеем у месцы Блоні, што непадалёк ад горада Мар'іна Горка, дзе сабраны звесткі пра мастакоў, творцаў, знакамітых людзей ды дзеячаў — ураджэнцаў і тых, хто пражываў на Пухаўшчыне. Дарэчы, філіялы музея знаходзяцца ў самой Мар'інай Горцы, а таксама ў вёсках Блужа і Гарэлец.

Месціцца экспазіцыя ў дыхтоўнай сядзібе, якая пабудавана ў другой палове XIX стагоддзя і з'яўляецца помнікам архітэктуры позняга класіцызму, — месцы жыцця і дзейнасці рэвалюцыянераў-народнікаў Бонч-Асмалоўскага, Анатоля Восіпава і Варвары Вахоўскай.

Аляксандр Прановіч правёў вельмі цікавую экскурсію, падрабязна, эмацыйна-выразна, з захапленнем, якое ўласціва толькі ўлюбёным у сваю працу, распавядаў пра родны край, адметныя факты з біяграфій слынных людзей.

У будынку шмат розных тэматычных залаў, напрыклад, знакамітых людзей, якія наведваліся сюды. Сярод іх: Іван Пуліхаў і Пётр Румянцаў, Адам Багдановіч і Леся Украінка, сёстры Ізмайловіч ды Якуб Колас і інш.

Вельмі прыгожа абсталяваны інтэр'ер сялянскай хаты. Адчуванне такое, нібы сапраўды трапляеш у пазамінулае стагоддзе ў госці да дбайнай гаспадыні, якая толькі хвіліну таму выйшла ўпраўляцца па гаспадарцы.

Асобныя залы прысвечаны паселішчам Пухаўшчыны, Вялікай Айчыннай вайне. Да слова, у вайну на тэрыторыі раёна дзейнічалі сем партызанскіх брыгад і тры атрады. Пяць камандзіраў атрымалі ганаровае званне Героя Савецкага Саюза. А з фронтоў Другой сусветнай вайны не вярнуліся 5457 ураджэнцаў раёна.

Адна з залаў носіць назву "Нашы землякі — знакамітыя людзі". Тут сабраныя экспазіцыі з біяграфічнымі дадзенымі, творамі і работамі слынных сыноў і дачок раёна, сярод якіх: браты-мастакі Ткачовы (Сяргей ды Аляксей), Леанід Леўчанка, Барыс Рэпін, Міхаіл Ельскі, Аляксандр Шабалін, а таксама Ігар Лучанок, Валянцін Белахвосцік і шмат хто яшчэ. Асобнае месца займае экспазіцыя, прысвечаная жыццю і творчасці Таісы Бондар.

У экспазіцыйнай зале знаходзяцца фотаздымкі, творы і звесткі пра адметных людзей, хто наведваў Пухаўшчыну, адпачываў улетку ў Доме творчасці беларускіх пісьменнікаў у Мар'інай Горцы. Тут былі Міхась Лынькоў, Пятрусь Броўка, Кандрат Крапіва, Пятро Глебка...

Наступным нашым прыпынкам стала Мастацкая галерэя Пухавіцкага раённага краязнаўчага музея, якая месціцца ў Мар'інагорскім гарадскім палацы культуры. У ёй размешчана каля 250 работ мастакоў-ураджэнцаў і тых, хто пражываў на Пухаўшчыне. Сярод іх: скульптары Аляксандр Фінскі, Генадзь Мурамцаў, старэйшы беларускі мастак Генрых Бржазоўскі, а таксама выбітныя мастакі Б. Рэпін, А. Пашкевіч, В. Барташэвіч, Л. Гоманаў, М.Валынец і іншыя. Кожны асобны малюнак — гэта пэўны раздзел своеасаблівай мастацкай паэмы, якая адлюстроўвае духоўную існасць эпохі, распавядае пра мінулае і сучаснасць нашай краіны, раскрывае яе прыгажосць і напаўняе сэрца радасцю. Бо адна з галоўных мэт мастака — ствараць радасць. Для творцы няма другаснага, для яго ўсё прыгожа, таму што ў кожнай істоце, у кожнай рэчы яго пранізлівы погляд адкрывае характар, а гэта значыць — тую ўнутраную праўду, якая праглядвае праз знешнюю форму, якая і ёсць сама прыгажосць. Мастак здольны знайсці і перанесці на палатно незвычайнае ў звычайным і звычайнае ў незвычайным.

Як зазначыў наш фатограф, які здымаў не адзін дзесятак розных галерэй і выставак, таму, з якім густам падабраныя карціны і афармлены інтэр'еры, могуць пазайздросціць не толькі абласныя, але і сталічныя экспазіцыі.

Акрамя мастацкай галерэі, у будынку знаходзіцца пакой прыроды, дзе экспануюцца прадстаўнікі флоры і фауны раёна.

Вялікая зала, што носіць назву "Якуб Колас. Прырода і людзі роднага краю", прысвечана жыццю і творчасці нашага славутага песняра. Тут сабраны яго выданні, сямейныя фотаздымкі і дакументы. А на сцяне вісіць вялізны партрэт пісьменніка, а пад ім радкі: "...Я мімаволі ўспамінаю// і ў той куток імкнуся зноў,// дзе жыў я ціха, як у раю,// з сваёй сям'ёю між дубоў".

Наша спадчына захоўваецца намаганнямі апантанага, адданага сваёй працы Аляксандра Прановіча і яго паплечнікаў, за што ім вялікі шчыры дзякуй. Пабачыўшы ўсё гэта, упэўніваешся, што калі ёсць такія людзі, беларускія мастацтва, літаратура і, увогуле, культура ніколі не апынуцца ў заняпадзе. Яны пяшчотна зберагуцца для нашчадкаў, будучых пакаленняў. Застаецца толькі адно: трэба з маленства выхаваццелям, настаўнікам і ў першую чаргу бацькам прывіваць дзецям любоў да прыгожага, да радзімы. Як кажуць, лепшы сродак прывіць дзецям любоў да айчыны заключаецца ў тым, каб гэта любоў мелася ў бацькоў.

А ўвогуле, кожны чалавек павінен ведаць свае карані, гераічную мінуўшчыну сваёй радзімы і слынных, таленавітых, адметных прадстаўнікоў краіны, якія зрабілі важны ўнёсак у развіццё мастацтва, літаратуры, музыкі, адным словам, у нашу духоўную спадчыну.

Віктар КАВАЛЁЎ

Фота К. ДРОБАВА

Анатоль Сульянаў — пісьменнік, генерал-маёр авіяцыі, заслужаны работнік культуры Беларусі. Ім напісаны раманы "Расколатае неба", "Блакітныя снягі". "Арыштаваць у Крамлі", аповесці "Толькі адна ноч", "Нампаліт", "Трэці пілот". Нядаўна выйшла яго кніга "Маршал Жукаў. Слава. Забыццё. Бессмяротнасць".
За раман "Расколатае неба" ўзнагароджаны Літаратурнай прэміяй і медалём Аляксандра Фадзеева.
Скончыў авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў і ваенную акадэмію. Праходзіў службу на Чукотцы, Камчатцы, Курыльскіх астравах, Новай Зямлі і Зямлі Франца Іосіфа.
У Мінску жыве амаль 30 гадоў.

Наш пазаштатны карэспандэнт Яўген ХВАЛЕЙ сустрэўся з Анатолем СУЛЬЯНАВЫМ.

Сын зямлі і неба

— Анатоль Канстанцінавіч, вы — кадравы вайсковец, набліжаецца слаўная дата — 60-годдзе Вялікай Перамогі. Хоць вы і не ваявалі на фронце, але дзяцінства ваша апалена вайной. Раскажыце крыху пра яго...

— Я нарадзіўся ў Падмаскоўі, заканчваў школу ў Захараве, дзе жыў Пушкін да яго паступлення ў ліцэй. Гэта наклала адбітак на ўсё маё жыццё. Адсюль і мая цяга да літаратуры, якую я любіў з маленства. Дарэчы, там зараз Пушкінскі мемарыяльны запаведнік, па значнасці другі пасля Міхайлаўскага.

У 1942 годзе на фронце загінуў мой бацька. На руках у маці засталося трое дзяцей. Мне, старэйшаму, — 14 гадоў. Добра, што ў нас была карова. Яна ратавала не толькі нас, але яшчэ і 8 раненых чырвонаармейцаў, якія спыніліся ў нашай хаце. Я марыў стаць лётчыкам. І ў 1943 годзе паступіў ў Маскоўскую спецшколу ваенна-паветраных сіл. Гэта была ваенізаваная школа. Мы насілі пагоны, хоць былі вучнямі старэйшых класаў. Ваенізаваныя школы ўвёў у 1938 годзе сам Сталін. У разгар вайны нас накіравалі на зборы ў Сібір. Мы там пражылі зіму на лютым марозе. З намі вучыўся сын славутага лётчыка Валерыя Чкалава — Ігар. Мы з ім пасябравалі. У 1944-ым вярнуліся ў Маскву. І зноў — вучоба.

— Гэты час знамянальны. Вайна кацілася на Захад — туды, адкуль прыйшла. Ішло вызваленне Беларусі, ажыццяўлялася знакамітая аперацыя "Баграціён". Як адбілася тады ў вашай душы само слова — Беларусь?

— У двары нашай спецшколы размяшчалася Акадэмія навук Беларусі. Гэта Чапаеўскі завулак. Вялізныя склады папер, на якіх я чытаў: Беларусь, Беларусь... У нас вісела вялікая карта, памечаная сцяжкамі. Сорак трэці год — вызваленыя Кіеў, Гомель... Сорак чацвёрты — Магілёў, Віцебск... Кожны дзень нампаліт праводзіў палітінфармацыю па сітуацыі на фронце, і мы адзначалі сцяжкамі ўзятыя нашымі войскамі гарады. А калі вызвалілі Мінск (у спецшколе вучыліся два хлопцы з Беларусі), радасці не было канца. Тых хлопцаў-беларусаў мы кідалі на руках угару...

Гадоў восем назад я акунуўся ў гісторыю Вялікай Айчыннай вайны на Беларусі. Вывучыў яе дасканала. Стварыў сцэнарый фільма "Імем Баграціёна". Дык вось, такой ваеннай аперацыі, як "Баграціён", не было ў гісторыі чалавецтва. Больш за 1000 км па фронту, 650 — у глыбіню. Гэта была першая аперацыя, у якой распрацоўвалі планы на хвіліны па часе. У Сталінградзе — на суткі, пад Курскам — на гадзіны, а тут... Мне пашанцавала сустракацца з сынам вядомага палітработніка 1-га Беларускага фронту, якім камандаваў Ракасоўскі, Цялегіна. Ён мне шмат расказаў аб узаемаадносінах Жукава і Ракасоўскага...

— У выніку чаго з'явілася ў вас кніга "Маршал Жукаў. Слава. Забыццё. Бессмяротнасць"?

— Не толькі ён, Цялегін, мне дапамог. Мне асабіста расказвалі пра Жукава маршалы Ракасоўскі, Рудэнка, Баграмян, Чуйкоў, генерал Батаў... Я сядзеў у архівах і бібліятэках Масквы, Мінска... Жукаў шмат аддаў Беларусі. Тут ён 17 гадоў служыў да вайны, выкладаў ваенную справу ва універсітэце, будаваў масты, бальніцы. На вуліцы Захарава ў Мінску стаяў яго кавалерыйскі корпус, былі канюшні тут. У час вайны на тэрыторыі Беларусі ён кіраваў карніетам двух франтоў — 1-га і 2-га Беларускіх.

— Вы, Анатоль Канстанцінавіч, прычыніліся да ваеннай гісторыі Беларусі, будучы не беларусам. Вельмі пахвальна. Звязалі і лёс свой з Беларуссю. І творчасць жа ваша пачыналася тут?

— Я прыехаў служыць у Мінск у 1976 годзе. І вельмі хацеў сустрэцца з Васілём Быкавым. Ён быў маім кумірам. Я вучыўся ў Ваенна-палітычнай акадэміі, там нам чыталі па 30 гадзін літаратуру. А часопіс «Новый мир» быў у нас ледзь не настольнай кнігай. Калі трапіў я служыць на Поўнач, у адным з нумароў "Нового мира" прачытаў аповесць Васіля Быкава "Мёртвым не баліць". Вайну я крыху ведаў, у пачатку яе перажыў юнаком такое, што і сёння пры ўспаміне ідуць па спіне мурашкі. Уявіце, на людзей, жывёлу пікіруюць варожыя самалёты. Крыкі параненых, рык кароў, іржанне коней... І ў канцы — крывавае месіва. Вось там я цудам і выжыў... А ў аповесці Быкава — ніводнага немца. Толькі пакуты сваіх салдат. Гэта перавярнула маё ўяўленне аб вайне...

— Я ведаю, што вы былі сябрам Васіля Быкава. Ён жа стаў і вашым літаратурным хросным. У творчасці сваёй вы ў многім вучыліся ў знакамітага пісьменніка-франтавіка. Як вы пазнаёміліся з Васілём Уладзіміравічам?

— У першы ж мой прыезд у Мінск пасля новага прызначэння я вырашыў адразу пабыць у Гродне. На верталёце паляцеў туды выконваць вайсковае заданне. Выканаў яго, прызямліўся, зайшоў у гаркам партыі. Прадставіўся і папрасіў, каб мяне пазнаёмілі з Быкавым. Мы зайшлі ў "Гродзенскую праўду", у кабінет Васіля Уладзіміравіча. Яго там не засталі. Мне паказалі яго крэсла за сталом. І так захацелася сесці ў яго, што я папрасіў дазволу. "Сядайце, калі ласка..." — адказалі мне. Я з такой радасцю сеў у крэсла Быкава. На стале акуратна, усё па месцах раскладзена. На жаль, у той дзень я не дачакаўся пісьменніка. І толькі пасля пераезду Васіля Быкава ў Мінск мне пашчасціла з ім пазнаёміцца. Я даведаўся, што з ім сябруе Мікола Матукоўскі. Выйшаў на яго, і мы паехалі на кватэру Быкава. Там былі яшчэ некаторыя творцы. Я слухаў увесь вечар толькі Васіля Уладзіміравіча, лавіў яго кожнае слова. Запамінаў яго міміку, скупыя жэсты. На мяне ён зрабіў тады велізарнае ўдзеянне. Ну а пасля неяк само сабой у нас завязалася сяброўства. У яго сын быў ваенны. Аднойчы мы паехалі разам у Мачуліпчы ў авіяцыйны полк. Ён нават сеў у кабіну самалёта і ўсё дзівіўся зручнасці і складанасці прыбораў. Потым зайшлі да лётчыкаў, паабедалі ў сталовай. Вось так мы і сябравалі больш за 25 гадоў. Быкаў быў адным з першых чытачоў майго першага рамана "Расколатае неба". Ён жа мне даў рэкамендацыю ў Саюз пісьменнікаў. У мяне шмат фотаздымкаў, на якіх мы побач з Васілём Уладзіміравічам, амаль усе яго кнігі з дарчымі подпісамі.

— Цікава ведаць, Анатоль Канстанцінавіч, на якія тэмы, аб якіх праблемах, маючы на ўвазе літаратуру, вы гутарылі з Васілём Быкавым? Верыцца, што вайна там прысутнічала заўсёды...

— Несумненна, як можна было абысці экстрэмальныя ўмовы, у якія трапляюць салдаты на вайне ды часам і ў мірны час. Аснова ўсёй творчасці Быкава: умовы і чалавек, якому звышцяжка, дзе ёсць выбар — мужнасць, гераізм, бессмяротнасць ці баязлівасць, здрадніцтва, забыццё як кара. На прыкладах герояў яго шматлікіх твораў, асабліва Сотнікава і Рыбака, у нас былі надта ажыўленыя размовы...

— Відаць, няма сакрэту ў тым, што вы паказвалі Васілю Быкаву рукапісы сваіх раманаў, аповесцей, кінасцэнарыяў, якія амаль усе на вайсковую тэму. Ці рабіў ён нейкія істотныя заўвагі, каб твор быў больш дасканалым?

— Ну, вядома ж, хто мог быць лепшым дарадчыкам у творчасці, як не Быкаў. Гэта было шчасце. Хоць даводзілася часам і перахваляцца, слухаючы яго. Ён мог параіць пераставіць месцамі нейкія часткі твора, каб ён больш загучаў, выкінуць неабавязковыя эпізоды. Звычайна казаў: "Гэта цікава і гэта працуе на гарманічнасць твора, а вось гэта сумнавата..." Усе яго заўвагі насілі рэкамендацыйны характар. Маўляў, ты аўтар і табе вырашаць — прыслухоўвацца ці не да заўваг збоку. Яго далікатнасць якраз і падкупляла: ну як не паслухацца такога мэтра?

У Быкава я навучыўся адносінам да творчасці, да чыстага аркуша паперы. Гэта мой настаўнік, які дапамагаў мне набыць пісьменніцкі почырк. А яго, Быкава, ніхто не вучыў — яго вучыла вайна. Праўда, аднойчы мне прызнаўся, што псіхалагізму навучыўся ў Дастаеўскага. Пэўныя адносіны да часу, міру і вайны, да творчасці ён выказаў у лістах да мяне, калі жыў у Фінляндыі, Германіі, Празе ў апошнія свае гады.

— Дзякуй, Анатоль Канстанцінавіч, за змястоўную гутарку і дазвольце пажадаць вам перад слаўным юбілеем Вялікай Перамогі здароўя і новых творчых здзяйсненняў.

«Ацэньваць не бяруся...»

Літаратурны працэс уключае ў сябе не толькі стварэнне мастацкіх твораў, гэта, паводле вызначэння прафесара В. Рагойшы, "гістарычна абумоўленае развіццё літаратуры як комплексу ўзаемазвязаных фактаў і з'яў". Крытыка, пераклад таксама з'яўляюцца неад'емнай і важнай часткай літаратуры. Таму сёння мы прапануем "самакрытыку" літаратуразнаўцы.

Іван Чарота — літаратурны крытык, перакладчык, доктар навук, прафесар, аўтар і ўкладальнік шматлікіх кніг, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» і ўладальнік некалькіх айчынных і замежных узнагарод.

— У адказе на апытанне "ЛіМа" адносна пісьменніцкай творчасці вы сказалі наступнае: "...Пісьменнікам, у адрозненне ад людзей нармальных, уласціва яшчэ выдумляць праблемы — апроч тых, што аб'ектыўна існуюць і перманентна ствараюцца ў рэальнасці". А вам гэта ўласціва? Калі так, то што канкрэтна?

— Уласна, адказваючы на апытанне "ЛіМа", я меў на ўвазе не толькі і не столькі творчыя моманты — што, дарэчы, запраграмавана самой анкетай. Адпаведна, мне хацелася адзначыць перш за ўсё наступнае: у гэтай сферы вельмі часта нашы пісьменнікі, не жадаючы ці не маючы магчымасці вырашаць рэальныя праблемы, выдумляюць нейкія дадатковыя, "свае". Інакш кажучы, мне хацелася яшчэ раз падкрэсліць тое, пра што ўжо заводзіў размову на старонках "Полымя" ў 2004 годзе — калізіі, з якімі сутыкаецца і якія сам правакуе беларускі пісьменнік, калі блытае рэальнасць з віртуальнасцю. Я меў на ўвазе рэальнасць і віртуальнасць палітычную, сацыяльную, эканамічную, духоўна-культурную і акцэнтаваў пры гэтым, мякка кажучы, неадэкватнасць рэакцый, г. зн. віртуальнасць у яе актуальна-негатыўным змесце.

Ваша пытанне пераводзіць увагу на пісьменніцкую творчасць непасрэдна. Гэта іншы аспект. У мастацкім творы павінна, паводле азначэння, прысутнічаць тое, што цяпер называюць віртуальнасцю, а гэта значыць і "выдумванне праблем". Аднак мне хочацца прадоўжыць свае сціплыя развагі ў тым самым кірунку: на жаль, мы не можам пахваліцца творамі, якія належным чынам ставяць і вырашаюць складанейшыя і актуальнейшыя пытанні часу, якія даюць глыбокія адказы на іх, прапаноўваюць універсальныя метафары нашага быцця. Такія, напрыклад, як у Ф.Дастаеўскага, І. Андрыча, В.Распуціна альбо Ю.Кузняцова.

А паколькі ваша пытанне датычыцца канкрэтна і маёй маленькасці, павінен сказаць, што ад такога роду праблем не ўхіляюся і паводле сваіх магчымасцяў — вядома ж, сціплых — стараюся трымаць іх пад увагаю сам і прыцягваць да іх увагу іншых.

— Ці атрымліваецца ў вас "служыць Славеснасці" — адпаведна яе "вышэйшаму прызначэнню": "вызнаваць Любоў, Ісціну, Хараство, Сумленне, сцвярджаць Духоўнасць"?

— Не ведаю, як хто, а я здаўна крануты вось чым: у славянскай духоўнай літаратуры ад старажытнасці паняцце "бессловесныя" азначае жывёл, звяроў; чалавек жа ў гэтую катэгорыю можа трапіць толькі праз сваё ўласнае (анамальнае — грэшнае!) жаданне-імкненне быць такім, таму што Бог стварыў яго "словесным". Ну а літаратар, пісьменнік мае ўсе падставы і правы "служэнне Славеснасці" лічыць служэннем, да якога заклікаў Гасподзь. Адпаведна, гэтак і я, не баючыся пафасу, мог бы тлумачыць, што разумею пад сваім прызначэннем па вялікім рахунку. А калі патрэбна ўдакладняць нешта, мог бы спасылацца на цудоўныя выразы малітвасловуя: "просвещение очию сердца моего"; "просвети моя умныя очи сердца"; "дай сердце мудрое...", "ословеси живот мой, Многомилостиве...", а таксама на звароты вышэйшага рангу славеснікаў: "Ословеси живот мой, Премудрое слово Божие"; "Пусть величат Тебя, Господи, все создания — не для того, чтобы Тебя сделать великим, но самих себя"... Хіба не гэтак павінны азначацца памкненні, мэты, ідэалы ўсіх нас?

Ці ўдалося мне дасягнуць такога ідэалу? Пэўна ж, не. І наколькі рухаўся ў гэтым накірунку, няхай ацэньваюць іншыя. Вядома ж, будзе і Вышэйшы, Апошні суд. А я толькі паўтару, што, здаецца, стараўся нешта рабіць — найперш у плане, які азначаны працягам уключанай вамі ў пытанне маёй фразы (нагадаю): напамінаць сабе грэшнаму ды бліжнім пра Неба, а ў жыцці зямным падтрымліваць сілы стваральныя і супрацьстаяць сілам разбуральным. Калі нешта ўдавалася-такі, за гэта ўдзячны Богу, народу, роду, бліжнім, настаўнікам... Менш ці больш ("менш", бадай, незалежна ад таго, што хочацца, каб выходзіла "больш") арыентаваўся на гэта ў сваіх лекцыях, у публіцыстычных, літаратурна-крытычных і навуковых публікацыях, а таксама ў перакладах.

— А ці не маглі б вы гэта выкласці канкрэтней?

— Магу. Давайце я проста акрэслю справы, у якіх маюцца нейкія вынікі.

Дык вось, на працягу амаль двух дзесяцігоддзяў я спрабую асэнсаваць гісторыю айчыннай славеснасці паводле крытэрыяў духоўнасці, у выніку чаго з'явіўся шэраг даследчыцкіх і эсэістычных публікацый, а таксама тры анталогіі: **"Насустрач Духу. Анталогія беларускай хрысціянскай паэзіі" (2001); "Насустрач Духу. Анталогія беларускай хрысціянскай прозы" (2002) і "Слово и Дух. Антология русской духовной поэзии X-XX вв." (2003).** Праца ў гэтым кірунку, дарэчы, не спыняецца, і спадзяюся, што з часам убачаць свет дапоўненыя, удасканаленыя выданні названых анталогій. Таму зноў, як і раней, звяртаюся да пісьменнікаў, каб прапаноўвалі свае творы — мною дагэтуль не заўважаныя ці напісаныя апошнім часам. У сувязі са згаданай працаю зараз не лішне, думаю, паставіць вось які акцэнт: мы чакаем (а то і патрабуем) ад пісьменнікаў, каб яны былі адданымі носьбітамі мовы; а гэтага ж мала, недапушчальна мала, калі ігнаруецца іншая роля — быць носьбітамі духоўнасці.

З гэтым звязаны многія мае вялікія намеры і невялічкія, па магчымасцях, напрацоўкі. Асаблівыя гонар, задавальненне і духоўна-інтэлектуальную карысць я маю ад таго, што ў складзе Беларускай Біблійнай Камісіі займаюся перакладам на беларускую мову Свяшчэннага Пісання. Два месяцы таму выйшла з друку чацвёртае Евангелле ў перакладзе Камісіі, рыхтуецца богаслужбовы варыянт Чацвераевангелля. Паколькі гэтая справа сама па сабе надзвычай складаная, а яшчэ ж яе суправаджаюць своеасаблівыя рэакцыі "грамадскасці", то давялося засяродзіцца таксама на аналітычна-даследчай працы і напісаць кнігу **"Беларуская мова і Царква"**, выдадзеную ў 2001 годзе на сродкі Царквы з благаславення мітрапаліта Філарэта, які, сведчу, сапраўды робіць усё, каб у сувязі з нацыянальнай мовай Царква не мела праблем ні "гарачых", ні "гарачкавых".

Калі браць іншую сферу занятасці, магу адзначыць наступнае: выкладаючы ў БДУ сербскую літаратуру і пры гэтым не маючы належнага (дакладней, зусім ніякага) забеспячэння адпаведных курсаў тэкставымі матэрыяламі, я вымушаны быў рыхтаваць анталогію-хрэстаматыю **"Сербская літаратура"** на мове арыгінала ў пяці кнігах. Выдадзены тры з іх, а падрыхтаваны ўсе і ў дадатак яшчэ практыкум.

А як загадчык кафедры славянскіх літаратур вядучага універсітэта краіны маю абавязак стымуляваць развіццё айчыннай літаратуразнаўчай славістыкі, таму са сваімі калегамі запачаткаваў серыю адпаведных зборнікаў. Каму цікава, можа паглядзець: **"Славянскія літаратуры. Постаці", "Славянскія літаратуры. Постаці II", "Славянскія літаратуры. Праблемы развіцця"** — усе выдадзены ў 2003 годзе сціплымі тыражамі і на нашы ўласныя сродкі-складкі.

Адчуваючы вялікую патрэбу ў творах, насычаных якраз духоўнымі пошукамі, я прыйшоў да перакладаў сербскага багаслоўя XX стагоддзя, якія друкавалі і друкуюць некалькі выдавецкіх структур Беларусі і Расіі. Выйшла 11 такіх выданняў рознага аб'ёму, чакаецца неўзабаве яшчэ тры, і ў бліжэйшы час планую закончыць пераклад неверагодна цікавай і значнай ва ўсіх адносінах працы архімандрыта Юсціна Попавіча — "Рэлігія і філасофія Ф.М.Дастаеўскага"...

— Гэта пераклады на рускую мову?

— Так. Гэтага роду пераклады на беларускую мову ў мяне таксама ёсць; ды калі рускамоўныя мне замаўляюць, як ужо казаў, выдаўцы і Беларусі, і Расіі, то беларускамоўныя не зацікавілі пакуль што нікога, акрамя Петра-Паўлаўскага сабора, які ў свой час выпусціў зборнік **"Сербская Праваслаўная Царква" (1998)**. Атрымліваецца, што яны без патрэбы, гэтаксама як і дзесятак кніжак даўно зробленых мною перакладаў уласна мастацкай літаратуры — з сербскай і іншых моў народаў былой Югаславіі. І ляжаць яны, што называецца, мёртвым грузам ужо многія гады.

— Але вашу працу ўсё ж такі заўважаюць і ацэньваюць. Як нам стала вядома, вас узнагародзілі ордэнам Святога Савы. Што гэта за ўзнагарода? Хто яшчэ яе атрымліваў?

— Святы Сава — заснавальнік Сербскай Царквы як аўтакефальнай і, фактычна, заснавальнік сербскай літаратуры як нацыянальнай. Ордэн Святога Савы быў устаноўлены гадоў сто пяцьдзесят таму ў якасці найвышэйшай узнагароды Каралеўства Сербіі. Такім ён заставаўся ў часы існавання Каралеўства Югаславіі — г.зн. да 1944 года, калі створана Югаславія камуністычнага ладу, якая гэтую ўзнагароду ад каралеўскай улады браць у спадчыну, зразумела, не магла — зрэшты, як і ўсё, звязанае са святым Савам. Гэта зрабіла Сербская Праваслаўная Царква. Так што ад Сербскай Царквы я і маю вялікі гонар быць узнагароджаным. Праўда, пакуль што атрымана не ўзнагарода, а толькі інфармацыя пра ўзнагароджанне, якое, па традыцыі, здзяйсняецца асабіста Патрыярхам Сербскім — Яго Святейшаствам Паўлам. Што ж датычыцца іншых узнагароджаных, то я гэтага дакладна не ведаю і не магу ведаць. Хіба што як даследчык сувязяў магу сказаць: звестак пра беларусаў, якія атрымлівалі ордэн Святога Савы, пакуль не сустракаў.

— Вы доўга займаліся югаславістыкай і сербістыкай у прыватнасці, а вось апошнім часам праявілі заўважную цікавасць да славацкай літаратуры і культуры. Чым гэта абумоўлена?

— Па-першае, дачыненне да сербістыкі і югаславістыкі ніяк не ў мінулым часе. Гэта на ўсё жыццё. І мара — каб не толькі для мяне, але і для маіх нашчадкаў, бо тут не проста занятак, праца, а большае, намнога важнейшае, пра што мімаходзь не хацелася б гаварыць. Славацкі ж накірунак мяне прыцягнуў дзякуючы пісьменнікам-славакам, якія разам з намі заснавалі Міжнародны Форум "Паслы славянства", а потым шчыра і плённа павялі працу па сцвярджэнні гэтай структуры — пра гэта я пісаў у "ЛіМе" за 28 студзеня г.г., і паўтарацца, відаць, няма сэнсу. Дадам хіба што пару слоў наконт Саюза пісьменнікаў Славакіі: у прыватнасці, што іхняя суполка (не адзіная пасля расколу ў выніку "перабудовы") актыўна дзейнічае, пасапраўднаму клапоціцца пра айчынную славеснасць і яе статус у свеце. Гэтаму нам бы павучыцца. А галоўнае — пазнаёміцца як след, дзеля чаго трэба скарыстоўваць усе магчымасці, асабліва ж — вельмі шчырыя крокі насустрач з боку славацкіх калег. І, дадам, абавязкова падтрымаць добрую ініцыятыву, якую праявіў наш пасол у Славакіі: абяцаючы падтрымку, заклікаў здзейсніць выданні сучаснай паэзіі — беларускай па-славацку і славацкай па-беларуску. Натуральна, што не згадзіцца папрацаваць над такім праектам я не мог.

— У згаданай вамі лімаўскай публікацыі ёсць прызнанне: "Я светла зайздросцю славацкім калегам і радаваўся за краіну, у якой інтэлігенцыя адказна ставіцца да запаветаў продкаў, а таксама выхоўвае годную змену ў нашчадках". А як вы самі вырашаеце такія ж задачы ў якасці прафесара універсітэта?

— Гэта, бадай, самае цяжкае пытанне — цяжкае аб'ектыўна, у плане магчымасцяў яго вырашаць. Ужо таму, што мы на працягу многіх гадоў зацята абрывалі повязі між пакаленнямі. І надзвычай балюча канстатаваць, што для майго пакалення ланцужок "продкі — мы — нашчадкі" ўяўляецца калі не парваным канчаткова, дык у стане, страшна блізкім да гэтага. Таму мы павінны браць пад увагу не зацяганую і да бязглуздзіцы даведзеную нібыта праблему "бацькі і дзеці" (у здаровым грамадстве такой праблемы, па вялікім рахунку, існаваць не можа!), а патрэбу ў захаванні (дыскрэдытаванай намі зноў-такі амаль дарэшты) *традыцыі як матэрыялізацыі вечнасці* — прашу падкрэсліць. Вось гэта я на працягу больш як трыццаці гадоў педагагічнай працы лічыў і лічу неабходным даводзіць сваім студэнтам: і праз літаратурны матэрыял, як гаворыцца, і не толькі. А што з маіх намераў ды спраў атрымліваецца, ацэньваць не бяруся. Дарэчы, вельмі асцерагаюся ўжываць азначэнне "мае вучні". Няхай лепш скажуць так тыя, каго я нечаму навучыў і сам вучыўся разам з імі, бо, зразумела, усё жыццё з задавальненнем вучуся. А якраз такога жадання малавата заўважаю ў сённяшнім пакаленні. Між тым, лепшыя вучні, вядома, — тыя, якіх чакаеш у будучым...

А. ЦІМАФЕЕЎ

Фота забяспечана аўтарам

Пранікнёнае і шчырае мастацкае слова, як вядома, магутна ўздзейнічае на свядомасць чытача. Яно вымушае перажываць усё тое, што перажываюць і пісьменнік, і яго героі. Па вызначэнні У. Калесніка, "мастацкі твор заўжды сплаў знешняга жыцця з унутраным жыццём мастака, дыялектычная еднасць адлюстравання і самавыражэння". Якія тэмы і праблемы на ўвазе мастакоў сёння, якімі сродкамі яны "самавыражаюцца"?..

Сіла слова

"Полымя" № 3

У кожнага чытача — свае "тэхналогіі чытання". Нехта любіць прачытаць твор "за адзін прысядак", іншы аддае перавагу чытанню расцягнутаму, удумліваму, каб пасля трох-пяці старонак паразважаць ды спраектаваць свае ўласныя прагнозы на далейшыя падзеі ў сюжэце. Вось апошнім і выдаецца цудоўная магчымасць дзеля пабудовы ўласных версій — развіцця падзей і верыфікацыі сваёй чытацкай інтуіцыі.

Часопіс "Полымя" пачаў друкаваць раман **Леаніда Левановіча "Пальнёвы вецер"**. Пачатак твора знаёміць з надзвычай вялікай колькасцю персанажаў, ды ўсе яны гэткія "характарныя", з такім важкім багажом жыццёвага вопыту, што проста вымушаюць напружыцца ў чаканні: што ж будзе далей, калі іх шляхі, нарэшце, сыдуцца ці перакрыжуюцца? Некаторыя з герояў увогуле ўвабралі гэтулькі супрацьлеглых характарыстык, што надта хочацца высветліць, чым яны насамрэч дыхаюць? Так, напрыклад, Бравусаў, былы ўчастковы інспектар міліцыі, які перапоўнены жарсцю да жонкі, здольны шчыра захапляцца пейзажнымі відарысамі, прагны да працы і надзелены яшчэ мноствам "станоўчых" характарыстык, мае ў сваёй біяграфіі і зусім іншыя факты... У дачыненні да вобраза героя няўзнак прамільгнула: "*У тую восень Бравусаў сваімі рукамі прыдушыў імянінніка...*". Далей — болей, не толькі гэты персанаж, але і жаночыя вобразы інтрыгуюць не ў малой ступені: "*Яна спадзявалася, што Бравусаў прапануе жыць разам. Прося хацела гэтага і ў той жа час баялася... Памятала маладога партызана Бравусава, які хацеў яе, жонку паліцэйскага, і малых дзяцей паставіць да сценкі, але старэйшыя партызаны не далі... А потым Прося шмат гадоў тайна сустракалася з участковым*". Падзеі ў рамане разгортваюцца ў пераломныя гістарычныя часы — 90-я гады XX стагоддзя: скаланаецца краіна ад маскоўскага путчу, збіраюць партфелі партыйныя функцыянеры, хістаюцца крэслы пад кіраўнікамі розных рангаў. Карацей, працягу рамана чытач, безумоўна, будзе чакаць нецярпліва: надта ж цікава, у які вузел усё завяжацца, а яшчэ больш цікава, як аўтар пасля з яго "выблытаецца"...

Натуральнае задавальненне атрымае чытацкая аўдыторыя падчас азнаямлення з нізкаю навел **Святланы Лобач**, што аб'яднана назвай **"Пажыві для людзей"**. Тут прываблівае і шчырасць аповеду, і даверлівасць інтанацый, і своеасаблівая мудрасць, якая прыходзіць да людзей толькі з багатым жыццёвым досведам. Па сутнасці, навелы ўяўляюць сабой лаканічныя занатоўкі эпізодаў чалавечага быцця, зразумелыя кожнаму, хто не быў надзвычайным пестуном лёсу, каму давялося досыць паблукаць жыццёвымі шляхамі. Мноства эмоцый увабралі гэтыя гісторыі — боль, сум, роспач, несумненна, і радасць. Ёсць пра што паразважаць пасля прачытання, ёсць што ўзважыць і асэнсаваць.

Янка Сіпакоў прапануе ўвазе чытача апавяданне **"Жонкі Ягайлы, або У дні апошніх салаўіных спеваў"**. Гэтая прыгожая гісторыя — рамантычная вандроўка ў мінуўшчыну, дзе ў цэнтры сюжэта — жыццё і лёс караля Ягайлы. Аўтар прадэманстраваў тут сваё бачанне і асэнсаванне нораваў і звычаяў продкаў, іх характараў і кошту крэўных сувязяў. Лейтматывам твора з'яўляецца выразная думка, што светам правіць каханне і супраць гэтага высокага пачуцця бяссільныя ўсе зласліўцы і зайздроснікі.

У рубрыцы ***"Старонкі лёсу"*** друкуюцца дзённікавыя запісы **Таісы Бондар**. Гэтыя своеасаблівыя лірычныя мініяцюры маюць відавочна эсэістычны характар: пісьменніца асэнсоўвае і з'явы грамадскага жыцця, і свае стасункі з калегамі па творчасці, і ўражанні ад пражытых дзён. Але, думаецца, асабліва цікавымі з'яўляюцца запісы, якія датычацца непасрэдна псіхалогіі творчасці, тых станаў, што перажывае кожны мастак — нараджэнне задумы і шляхі яе ўвасаблення, натхненне і дэпрэсіі, радасці і скрухі... Эмацыянальная, шчырая споведзь пакідае глыбокае ўражанне. Шэраг аўтараў прадставілі на старонках "Полымя" свае паэтычныя творы. **Мікола Маляўка** прапануе ўвазе чытача нізку вершаў, аб'яднаных назвай **"Слязой сплывае з неба зорка..."**, дзе адлюстраваны ўспаміны вясковага дзяцінства. **Васіль Жуковіч** выступіў з вершамі, рознымі па тэматыцы, але пераважная большасць з іх прысвечана прыгажосці роднага краю.

Назва цыкла вершаў **Віктара Шніпа "Балада аднаго кахання"** гаворыць сама за сябе. Творы датуюцца 1985 годам, маюць падзагаловак "З юнацкага" і з'яўляюцца разнастайнымі па эмоцыях — яны іранічныя, самотныя, пяшчотныя...

Каханнем "дыхае" і паэзія **Святланы Явар**. Яе вершы — гэта элегічныя радкі пра свет жаночага пачуцця, пра ўласцівую жанчыне самаахвярнасць і адданасць.

Старонкі жыццёвага і творчага шляху Сяргея Крыўца, заходнебеларускага паэта, жыццё якога абарвалася ў 1945 годзе, раскрывае **К. Камейша** ў рубрыцы ***"На паверцы — імёны"***.

Рубрыку ***"Навука"*** прадстаўляюць артыкулы **У. Цімашпольскага і М. Андрыянава "Флагман беларускай металургічнай прамысловасці"** і **М. Шамякінай "Сучасны дзень старажытнай навукі"**.

У раздзеле ***"Крытыка і літаратуразнаўства"*** змешчаны артыкул **Евы Лявонавай "Ад мовы да мовы масцілася кладка..."**, дзе аўтарка падзялілася сваімі думкамі аб праблемах перакладу на беларускую мову і дала змястоўную ацэнку анталогіі сусветнай паэзіі ў беларускіх перакладах XX стагоддзя "Галасы з-за небакраю". У артыкуле **"Гэта перамога — ёсць вера вашая..." Андрэй Дышлевіч** дае сваю ацэнку ролі У. Самойлы ў духоўным жыцці нацыі. Публікацыя **Усевалада Гарачкі "Жыццё і смерць — набыткі і страты"** — гэта погляд аўтара на творчасць Васіля Сахарчука, своеасаблівае асэнсаванне матываў яго паэзіі.

"Маладосць" № 3

У гэтым нумары "Маладосці" надрукаваны заключныя раздзелы рамана **Зінаіды Дудзюк "Велясіты"**, падзеі якога сягаюць у сівую даўніну, дакладней, разгортваюцца на мяжы VIII — IX стагоддзяў. Па-першае, хацелася б адзначыць, што з жанравым вызначэннем тут штосьці відавочна наблытана. Эпічны захад, якім распачынаецца гісторыя (пачатак твора надрукаваны ў "Маладосці" № 2) надта хутка зводзіцца да дыялогаў, якія па сутнасці і складаюць асноўную форму падачы матэрыялу, а невялікія маналагічныя адступленні нагадваюць аўтарскія рэмаркі ў драматычным творы. Так што па жанры твор значна бліжэй да п'есы, чым да рамана. А вось персанажаў тут столькі, што хапіла б не менш, як на тры раманы. Усяго хапае ў творы: тут славяне, грэкі, традыцыі, абрады, складаныя радаводы, гісторыі кахання. Па-рознаму можна інтэрпрэтаваць і сам ідэйна-эстэтычны змест, але дамінуе над усім, здаецца, банальная ісціна — у імкненні да ўлады мэта ***не*** апраўдвае сродкі, а кіраваць дзяржаваю варты адно толькі годны і мудры.

У гэтым нумары часопіса — сапраўднае раздолле прыхільнікам фантастычных гісторый. **Андрэй Паўлухін**, прадстаўнік так званай "кібер-панк літаратуры", прапануе чытацкай увазе фантастычную аповесць **"Хуткадзейнасць"**. Гэта чытво станецца ўдзячнай глебай для ўсіх жадаючых "пашырыць свядомасць". Сюжэт выклікае шэраг асацыяцый. Найперш згадваюцца шматлікія ўзоры камп'ютэрнай анімацыі, дзе шчыруюць рознага кшталту кібаргі. Некаторыя "фрагменцікі" і дэталі надта пазнавальныя па мастацкіх фільмах: згадваецца ўсім вядомыя "Тэрмінатар", "Mortal combat" ("Смяротны бой"), "Матрыца"... Структура сюжэта мае пэўнае падабенства з "Алісай у краіне цудаў" Льюіса Кэрала, дзе таксама ўсё дэфармуецца і відазмяняецца на вачах, усё складаецца з парадоксу і абсурду. Ва ўсякім выпадку, шчыра спадзяюся, што твор знойдзе свайго чытача...

Дакладных адрасатаў маюць фантастычныя гісторыі **Раісы Баравіковай "З казак старога астранаўта"**. Падзагаловак арыентуе: *"Касмічныя падарожжы. Чытанне-фэнтэзі для сярэдняга школьнага ўзросту"*. Думаецца, найперш гэтай аўдыторыі, узрошчанай на творах Дж. К. Ролінг, Дж. Р. Р. Толкіена і інш., прыйдзецца даспадобы беларускі варыянт фантастычных прыгод, маршруты якіх вызначаюцца як іншагалактычнымі, так і добра вядомымі, пазнавальнымі геаграфічнымі вехамі: узгадваюцца гарады Беларусі, сталічныя вуліцы ды праспекты. Нельга не прызнаць, што сам факт узбагачэння айчыннай літаратуры новымі (надзвычай папулярнымі ў падлеткаў) жанрамі і сюжэтамі, абнадзейвае, што ўрэшце школьнікі зацікавяцца і беларускім фэнтэзі.

Няйнакш як іранічнай фантастыкай можна ахрысціць апавяданне **Нікі Ракіцінай "Рыбка"**, якое сама аўтарка назвала *"абразком з жыцця адной сям'і"*. Калі даваць ацэнку твора па дзесяцібальнай шкале, то гэты "абразок" заслугоўвае "дзесяткі". На дзвюх часопісных старонках — своеасаблівы экстракт: гумару, досціпу, фантазіі і... філасофіі.

З цікавасцю чытаецца таксама рамантызаваная інтэрпрэтацыя старажытных нясвіжскіх легенд **Ірыны Масляніцынай "Чорны суддзя, прывідная сава і голас манахіні"**. А вось **Юрый Латыш** у **"Касмічнай адысеі"** робіць спробу зазірнуць *"за заслону таямніц і загадак, разгадваць якія дапамагае ўзровень цяперашніх тэхналагічных магчымасцей"*.

Серж Мінскевіч падзяліўся з чытачамі развагамі пра стан беларускай фантастычнай літаратуры ў артыкуле **"Па слядах яе вялікасці фантастыкі"**, засяродзіўшы ўвагу на творах Ю. Станкевіча, А. Паўлухіна і А. Аляшкевіча. Нельга не пагадзіцца з фінальнай высновай аўтара: *"Што ж, камусьці фантастыка падаецца гульнёй, дзяцінствам, лунаннем у аблоках, несур'ёзным відам творчасці. Аднак нават у мемуарах і "сухіх" дакументальных хроніках, як вам прызнаецца любы гісторык, заўжды прысутнічае аўтарская фантазія. Без яе не было б і навукі. Фантазія — першаштуршок ідэі"*. Думаецца, гэта выдатнае абгрунтаванне ўсіх "фантастычных" публікацый часопіса.

Паэзія нумара прадстаўлена вершамі **Сяргея Рабчуна "У полі памяці маёй...", Арцёма Арашонка "Камп'ютэрная аплікацыя"**.

Рубрыка ***"Да 60-годдзя Вялікай Перамогі"*** прапануе падборку вершаў з кнігі пра Вялікую Айчынную вайну, якую выдае ў гэтым годзе РВУ "Літаратура і Мастацтва". Гэта ўзоры паэзіі мінскіх школьнікаў, што спрабуюць асэнсаваць трагедыю, пра якую ведаюць толькі з успамінаў дзядоў ды па літаратурных творах.

З новымі вершамі выступіў у нумары **Мікола Мятліцкі**. Яго паэтычны свет прывабіць аматараў метафарычнай вобразнасці і эмацыянальнай узвышанасці. Многія вершы напоўнены рамантычнымі ўспамінамі "дзіўнай казкі залатой" дзяцінства, "хмелем памяці юнацкай", незабыўнай прыгажосці родных краявідаў...

"Нёман" № 3

Сярод празаічных твораў нумара — пачатак другой часткі рамана **Уладзіміра Гніламёдава "Восток"**. Тут разгортваецца эпічны малюнак падзей першай сусветнай вайны, рэтраспектыва пярэдадня Кастрычніцкай рэвалюцыі. Лейтматыў твора — паказ антыгуманнай сутнасці вайны, якая руйнуе чалавечыя лёсы, крута змяняе характары людзей, разбуральна ўплывае на свядомасць мірных жыхароў. Дарэчы, з беларускамоўным варыянтам рамана чытач меў магчымасць пазнаёміцца на старонках "Полымя" ў мінулым годзе.

Аповесць **Івана Сабілы "Товарная станция"** з першых старонак ахутвае атмасферай пасляваеннага часу, які пазначаны адначасова і радасцю Перамогі, і неймаверна складанымі ўмовамі існавання ў разбуранай сталіцы. Мастацкі свет твора — рэчаіснасць у асэнсаванні дзіцяці. Тут вачыма хлопчыка Паўлушы бачацца лёсы яго сяброў-суседзяў, гаротных дзяцей вайны, праз яго ж бачанне паказваюцца эпізоды жахлівых і небяспечных гульняў са зброяй...

Фантастычна-прыгодніцкае апавяданне **Генадзя Ануфрыева "Точка Омега"** чытаецца, як кажуць, на адным дыханні. Змястоўны і дынамічны сюжэт твора знаёміць са своеасаблівымі першапраходцамі Сусвету. Даследуючы новую планету, героі натрапілі на племя невядомых і таямнічых абарыгенаў...

Сваім паэтычным асэнсаваннем рэчаіснасці дзеляцца з чытачамі "Нёмана" **Эдуард Скобелеў, Мікола Мятліцкі** (пераклаў вершы з беларускай мовы Б. Спрынчан), **Барыс Беляжэнка** і **Мікола Антаноўскі** (пераклад з беларускай В. Грышкаўца).

Публіцыстыка прадстаўлена ў нумары артыкуламі **А. Андрэенкі "В тени глобального джихада"** і **У. Дорашава "Казаки XXI века"**.

У рубрыцы ***"Общество. Идеология. Государство"*** надрукаваны артыкул **Валерыя Зелянеўскага "Силою слова потрясаются истины..."**

Юбілейная рубрыка ***"К 60-летию Великой Победы"*** прапануе ўвазе чытача артыкул **"Фронтовой миномётчик" Рыгора Саланца**. Аўтар расказвае пра жыццёвы шлях сумленнага чалавека, франтавіка, які зрабіў свой немалы ўнёсак у справу вызвалення радзімы, мінчаніна Сцяпана Пятровіча Каржа. А ў артыкуле **"Был такой приказ — "Ни шагу назад!" Генадзь Жылінскі** выказвае свае погляды на шляхі дасягнення Вялікай Перамогі.

Літаратурная крытыка нумара прадстаўлена артыкуламі **Любові Гарэлік "...И в вольном слове воскресать": Штрихи к литературному портрету Евгении Янищиц"** і **Таццяны Хаміч "Постигая тайную отгадку...": К 85-летию со дня рождения Алексея Пысина"**.

У артыкуле **"Поэзия — состояние души..." Яўген Карпукоў** даў высокую ацэнку новай кнізе Ніны Маеўскай "Мая ўлюбёная краіна".

Увогуле часопісныя публікацыі сведчаць не толькі пра папулярнасць выданняў, пра агульную цікавасць да навін літаратурна-грамадскага жыцця, але, безумоўна, з'яўляюцца надзвычай выразным сведчаннем уладарнай і магутнай с і л ы с л о в а.

Лада АЛЕЙНІК

Анталогія Жыцця-Творчасці: чытанне для пераможцаў

Культ паэзіі як таемнага шэпту, адмысловага "свяшчэннага ведання" ўкараняўся ў грамадскай свядомасці, здаецца, не без удзелу саміх творцаў — прынамсі, большасць не дужа імпэтна адпрэчвала ауру загадкавага пакутніцтва, якою ахвотна надзяляла іх спачувальная публіка.

Алесь Пісьмянкоў, чалавек неверагодна сонечны і навальнічны адначасова, не браў удзелу ў гэтай "змове паэтаў" — свае вершы ён *думаў*.

Кніга "Думаць вершы...", што пабачыла свет у першыя месяцы 2005 года, магла б стацца (не такою ўжо *звычайнаю* ды *простаю* па сённяшнім часе) "данінаю павагі", ушанаваннем пісьменніка, прымеркаваным да гадавіны з дня яго смерці. Але не сталася — ні помнікам, ні эпітафіяй. Бо *знікнення* Алеся Пісьмянкова не адбылося, атрымаўся *працяг* — Жыцця-Творчасці.

Структура кнігі асацыіруецца з класічнай кампазіцыяй мастацкага тэксту, што абавязкова ўключае завязку дзеяння, яго развіццё, кульмінацыю і развязку. Змешчаны на пачатку выдання ўкладальнікам Віктарам Шніпом верш "Суцяшэнне", бадай, не з'яўляецца звычайным эпіграфам — ён бачыцца самастойным раздзелам гэтага *кніга-твора*, сумяшчае, здавалася б, супрацьлеглыя функцыі пралога і эпілога, бо тут змыкаюцца быццё і нябыт — жыццё... працягваецца ў смерці, тым сцвярджаючы ўласную адвечнасць:

Зямлёй,
травой,
кустамі
З табою некалі
Мы станем.
І будзе дождж ісці
над намі,
І будзе снег ісці
над намі,
І будуць воблакі
над намі,
І будуць зоркі
спець начамі,
Як над зямлёй,
як над травой,
як над кустамі...

Раздзел "Карані і крылы" (сюды ж уключаны і творы з нізкі "Партрэты", пяць "юнацкіх вершаў", а таксама падборка іранічна-алегарычных замалёвак "Настрой харошы даражэй за грошы...") — успрымаецца як самадастатковая кніга, цэльная (бо дазваляе меркаваць як пра мастакоўскае светаадчуванне, так і пра адметнасць яго эстэтычнага ўвасаблення) — і поліфанічная (бо рухомая, першасна пазбаўленая манатоннасці ды манументальнасці). Аднак у кантэксце зборніка "вершаў, эсэ, успамінаў" яна бачыцца своеасаблівымі **ўводзінамі** (не менш важка-важнымі, чым іншыя чыннікі кампазіцыі) у "літаратурна-сентыментальнае падарожжа", **уверцюрай** да такога *ліраэпасу*, дзе насамрэч з цяжкасцю можна адмежаваць інтуітыўнае ад рацыянальнага.

Згаданая цэльнасць "Каранёў і крылаў" спараджаецца, як ні парадаксальна, аўтаравым перакананнем, што творца па прыродзе сваёй асуджаны на адмысловую *двухсусветнасць* існавання. [Прычым любы чалавек, здольны не толькі атрымліваць асалоду ад быцця, але і ўсведамляць сваё прызначэнне, ад пачатку асуджаны на *жыццятворчасць*; ці не таму нават шараговы "чытач" непазбежна з'яўляецца... сааўтарам Творцы: *"Да апошняга // Ўсё разлічана // І пралічана // У Тварца. // Песня песняў // Амаль не чытана, // Не прачытана // Да канца. // Ах, як пахнуць лугі // За Воршаю! // Ах, які ў салаўя // Зачын! // Мы з табою, павер, // Не горшыя, // Мы не горшыя // Чытачы"* ("За Воршаю")]. Лірычны герой Алеся Пісьмянкова не пакутуе з-за неабходнасці выбіраць паміж "каранямі" і "крыламі"; для яго аднолькава важна адчуваць рэчыўнасць зямнога жыцця — і прадчуваць бязважкасць вечнасці. Зазначым, аднак, што бязважкасць гэтая паэтам нярэдка "апрадмечваецца" (гл., напрыклад, вершы "Размова з археолагам", "На зямлі радзімічаў"), а вечнасць — персаніфікуецца, набывае *чалавечае* аблічча, і прыватныя хронікі незаўважна зліваюцца ў Гісторыю ("Згадка пра Баркалабава, або Вечар са Святлейшым І.Г. Чыгрынавым", "Кастусь і Марыся", "Юдзіф і Алаферн", "Любім-трава" і інш.).

Медытатыўнасць "Каранёў і крылаў", абумоўленая ўжо самім аўтаравым крэда — "*думаць* вершы", мае плёнам настраёвасць мінорную, але не адчайна-песімістычную. Адзінота лірычнага героя сапраўдны **небеспадстаўная**: яна спароджаная не метафізічным "духам эпохі", а рэальнымі стратамі: *"Не заві, вярста, // У радзінны кут: // Сірата я там, // Сірата і... тут"* ("Туга"). Памнажэнне стратаў-*знікненняў* пераўтварае нават рэчыва часу — *"зноў прысмак у часу сірочы..."* ("Уздых"). Ды аўтар не дазваляе свайму лірычнаму герою трапіць у палон скрухі, акцэнтуючы ўвагу на тым, што перамога нематы над голасам, застыгласці над рухам — заўсёды часовая: *"Глухія кароткія дні // Нам трэба, як грып, перанесці, // ...Марозна лістота звініць // На бруку ў Траецкім прадмесці. // Жыву спадзяваннем на снег"* ("Прадчуванне"). [Цікава, што змаганне надзеі з безвыходнасцю разгортваецца ў самых нечаканых вымярэннях — напрыклад, у сферы паняційна-тэрміналагічнай: *"Зноў снег без марозу, // Зноў снег без марозу — // Зноў дзён аднастайных гурма, // Як постмадэрнісцкая нудная проза, // Дзе выйсця ў героя няма. // <...> Няўжо гэтак будзе бясконца? // Сюжэт безнадзейна завіс... // З марозам і сонцам, // З марозам і сонцам // Вярнуцца хачу ў рэалізм"* ("Асацыяцыя")].

Роздумнасць, якая ў дачыненні да творчасці Алеся Пісьмянкова ўяўляецца адным з важнейшых прынцыпаў эстэтычнага асваення быцця, кепска сумяшчальная з трыбуннай рыторыкай (хаця некаторым айчынным вершаскладальнікам цуд падобнай гібрыдызацыі ўдаецца не толькі здзейсніць, але і афіцыйна ўганараваць). Паэтыка "Каранёў і крылаў" угрунтаваная ў *рэчыўнасці*; у дадзеным выпадку маецца на ўвазе зусім не выцясненне вобразатворчасці (як прынцыповай шматзначнасці) бытапісальніцтвам (як просталінейным капіраваннем рэальнасці), але відавочна празрыстая логіка мастацкага спасціжэння і аднаўлення свету: *"Вось дом // Пад бярозай, // Вось дым // На марозе, // Вось след // Каля брамы: // МАМА..."* ("Бялынкавічы"). Набыццё "злепкам рэчаіснасці" якасці мастацкага вобраза адбываецца тут не за кошт арнаменталізацыі выказвання (упрыгожвання шматслойнымі тропамі, ускладнення паэтычнага сінтаксісу і г.д.), але шляхам яго максімальнага прасторавага сцяжэння — і гэткага ж максімальнага пашырэння асацыятыўнасці дзякуючы выкарыстанню ўнутраных магчымасцей гукапісу: *"Гусцее // Змрок, // Чуйнее // Ціш, // Цішэе // Крок, // Цяжэе, // Крыж"* ("Сумнае прызнанне").

Калі ў "Каранях і крылах" чытач мае шанц стацца саўдзельнікам *тварэння* цэлага свету, той мастацкай прасторы, дзе асобныя перажыванні, эмоцыі ды пачуцці лучацца — і напаўняюць нованароджаны асобасны космас вітальнай сілай, дык у наступным раздзеле — "Думаць вершы..." — ён можа браць удзел у гэтага свету *спасціжэнні*, характар, танальнасць і нават першапрычына якога вызначаецца аўтаравым жанравым удакладненнем — *"з літаратурна-сентыментальнага падарожжа"*.

Значэнне слова "сентыментальны" ў розных слоўніках раскрываецца праз указанне на залішнюю альбо празмерную ступень чуллівасці, уразлівасці. У "вершадуманнях" Алеся Пісьмянкова памянёная празмернасць аніяк сябе не выяўляе; *сентыментальнасць* тут, бадай, зразуметая хутчэй як эмацыйная шчырасць, непасрэднасць рэакцыі і незамутнёнасць ("неадрэдагаванасць") успамінаў да ўражанняў. Да ўсяго, змесціва пачуццёвай памяці нібыта прапускаецца праз цэлы шэраг "экспертыз" (на непадробнасць, дакладнасць, шчырасць і г.д.), што аўтар ладзіць сабе сам.

"Думаць вершы..." — твор сінтэтычны ў самых розных адносінах. Форма "літаратурнага падарожжа" дазваляе натуральным чынам спалучыць пейзажыстыку і тэарэтычную рэфлексію, інтуітыўнасць і аналітызм, лірызм і публіцыстычнасць. Падобная літаратура хоць і ўтрымлівае, бясспрэчна, прыкметы эсэістычнасці, але можа быць суаднесеная з эсэ роўна з той жа пэўнасцю, з якой яе дапушчальна назваць мастацкім нарысам ці лірычнай прозай, альбо (даруй Божа і браты па цэху!) крытычнымі імпрэсіямі... Што нават пры першым набліжэнні вылучае Пісьмянкову "паэзію думання" сярод селевай плыні сённяшняй айчыннай дзённікава-мемуарнай літаратуры (*нібыта* — каб не сказаць "квазі"! — *мастацкай*), дык гэта тое, што ён апавядае менавіта пра тое, пра што абяцаў расказаць. Напрыклад, у тэксце "Залаты запас Пысіна" засяроджваецца на "вымярэннях паэзіі" Аляксея Пысіна; у "Росным маліннику" смакуе словатворы Анатоля Вялюгіна (*"адметную, уласцівую толькі яму, лексіку — чыстазвон, санцавей, шугавей, вогнік, хмарачос, харашунчыкі"*); пад назовам "Шэсць рэчак Васіля Зуёнка" размова будзе ісці менавіта пра паэмы Васіля Зуёнка; гаворачы пра Анатоля Кудраўца, чалавека і пісьменніка ("Чалавек жыве, пакуль ёсць у ім душа"), Алесь Пісьмянкоў вызначае "імкненне да дасканаласці" ў якасці асноўнай рысы Кудраўцовай творчасці... паўсюдна забываючыся згадаць пра сябе, не парупіўшыся мімаходзь акрэсліць караценька ўласнае творчае крэда, чаго пераважная большасць сённяшніх *аўтабіёграфаў* не можа сабе дазволіць.

"Думаць вершы..." не сталася галерэяй літаратурных партрэтаў, праблем і недарэчнасцяў; не адчуваецца ў адносінах аўтара да прадметаў ягонай цікаўнасці і, так бы мовіць, "музейнасці" (гіпертрафіраванай пашаны, ускладненай вераю ва ўласную праніклівасць). Часам аўтар аднаўляе ў "ліраэпасе" тое, што ўжо занатаваў у вершы — і *вяртанне* гэтае ёсць не самапаўтарэннем, але ўшанаваннем насамрэч важнага, значнага, адзінкавага (параўнайце, напрыклад, вершы "Алёна і Аніссся", "Забяседдзе ў расе" — і "ліраэпічныя" творы "Верш пад абразамі", "Яго Бесядзь заўсёды чыстая"). Строга кажучы, у "літаратурна-сентыментальным падарожжы" не адшукаеш адзнак кульмінацыйнай завершанасці, яна падаецца тут недарэчнаю, надуманаю (як забойства раманістам героя напярэдадні вяселля ці атрымання тым Нобелеўскай прэміі). Нельга быць крыху цнатлівым альбо крыху разумным, гэтаксама нельга па ўласным жаданні перастаць думаць. Асабліва вершы.

Заключная частка кнігі — "Не знікай..." — мусіць, паводле "выходных дадзеных", лічыцца *ўспамінамі*. Увасабленне памяці ў слове, з аднаго боку, адчужае чалавека ад саміх успамінаў, прымушае карэкціраваць іх суадносна з эстэтычным кантэкстам; з другога боку, слова ў пэўным сэнсе дазваляе "спыніць імгненне", занатаваць свет такім, якім яго хочацца бачыць. Тэкст Алены Пісьмянковай "Такая ў нас пагода..." немагчыма назваць "успамінамі"; гэта насамрэч *працяг* размовы, "літаратурна-сентыментальнага падарожжа" — і жыцця, якое яны доўжаць *разам*: *"...Ты мог хітраваць з іншымі, толькі не з самім сабою, але нават у самым істотным, жыццёва важным Ты выступаў заўсёды як абаронца. "Народ ні ў чым не вінаваты, // Такая ў нас пагода...". Сёння з вышыні пражытага і перажытага разам з удзячнасцю звяртаюся да цябе. Ты быў і застаўся для мяне і нашых сыноў Чалавекам і Паэтам. <...> І я не развітваюся з табой"*. Аўтары змешчаных у апошнім раздзеле тэкстаў (дзе ёсць не толькі аповеды, але і вершы, і нават узор "творчага партрэта" з элементамі інвектывы ў адрас увішных "сяброў" паэта), бадай, не думалі пра тое, каб уваскрасіць Алеся Пісьмянкова ў слове. Бо для іх — і не толькі для іх — ён не быў, а *ёсць*, ён *застаўся*, ён *не здолее знікнуць*.

Ці не з гэтае відавочнае прычыны "Думаць вершы..." Алеся Пісьмянкова не стасуецца з паняццем "апошняй кнігі", не ўспрымаецца як "нагода для ўшанавання", яна бачыцца *працягам*, *спадзяваннем* — і ПЕРАМОГАЮ:

...Аж дыханне заняло —
Свет высозны!
Белы аркуш і сціло.
Я і космас.

("Надпіс на кнізе")

Ірына ШАЎЛЯКОВА

Алесь НІНЬКО

* * *

Жыццё пралятае
Паскораным тэмпам,
З вар'яцкім імпэтам.
А пошукі мэты —
Прыгожая казка,
Што розум расказваў
Так часта ўяўленню...

Бо пошук — не пошук,
Усяго толькі пошум
Апошніх мелодый,
Астатніх пытанняў.
Ніколі, дазвання
У пышнасці веры
Не знойдуцца дзверы.

Маўчанне — абраза.
Чаканне адказаў —
Страшэнная кара.

Для бога — замнога.
Для д'ябла — замала.

* * *

Мы вар'яцеем
Ад пракляццяў цемры,
Што распаўзлася
Пачварнымі плямамі,
І безліччу
Чорных адценняў
Мы ў цемень
Далёка загнаныя.
Ніводная метка
Не значыць нам шлях,
І роспачы кветкі
Цвітуць у вачах.

* * *

Ты мяне паланіла
Сваёй кволаю сілай
І усмешкай цнатлівай;
Я нібыта ўваскрос.
Тваю постаць анёла
Я малюю ў прасторы
Фарбай вечнаю зорак.
Ты — дарунак нябёс.

* * *

Адзінота.
Схавацца, і ўпотай
Блукаць сутарэннямі
Ўласных ілюзій.
Пазбыцца ў друзе,
Збіраць па аскепках
Крывое люстэрка.
На сцежках,
Парослых сумненнямі,
Збочыць у цемру,
І там
Адолець сябе
І спасцігнуць.

Нарэшце —
Памерці і знікнуць,
Каб зноў нарадзіцца
І крыкнуць.

* * *

Дэфіцыт уласных думак
І пачуццяў інфляцыя —
Сумны рахунак
Цывілізацыі.

* * *

Стаю на раздарожжы,
Каля ўваходу ў храм.
Ніхто не дапаможа:
Мой шлях — я сам.

Міхась СТРЫГАЛЁЎ

Прадвесне

Хмур наганяе вятрыска
купін лядовых наўкруг.
Гэта — прадвесне.
Блізка
І крыгалому грук.

Хутка вясеннія воды
перабягуць праз бугор —
сінія вочы прыроды
суправаджаюць дазор...

Сосны ў бяздоннай вадзе
кронамі ўніз перакулены.
Дызеля грук на градзе —
рытмы пляцовак, дзе
старты брызентам атулены.

Часу велічным напевам

За тваё радкі — на дзіва —
нават вельмі можа стацца,
і нашчадкі і радзіма
манументаў не паставяць.

Толькі ў сонечным стагоддзі
між старызны на паддашку
пальцы дзіваку апаліць
зборнік лірыкі лядашчай...

Так цябе з тваёю Музай
"Жыціе" паліла мукай —
нескаронай вешчай думай
пратапопа Авакума...

І ўзляціць лістотай дрэва,
што Паэзіяй завецца, —
часу велічным напевам
у нашчадках адгукнецца!

Сандуноўскія лазні

Зайздрошчу вашаму лазеншчыку,
о Сандуноўскія Лазні:
ён у парыльні паршчыкам
усім адбівае паншчыну!
Высока — на лаўцы — на Яць ён,
заўважце, не адбывае, а адбівае
венічкам!
І — вам, асабіста вам, прыяцель,
як некалі Аляксандру Сяргеевічу...

Як некалі — Антону Паўлавічу,
выдатна любіўшаму парыцца
з гараданачальнікам
у суседстве цесным
для плёну расійскай славеснасці...

О божа! Якое слова
раджала рысталішча Сандунова,
калі дэбютанта і генія
хвасталі бярозавым венікам...

Стоячы на верхатуры-строме,
лежачы у сярэбраных ражках —
аж барадзе вальяжна,
бярозавым шпарыць літасціва
па ягадзіцах графа Талстога
ці, скажам, па ягадзіцах
Яго імператарскай Вялікасці...

Прыяцель, і вы, мажліва,
пад венічкам,
як пад лісточкам фігавым,
блішчалі у прылазніку
ці ў Парыльні гулліва,
як Еўтушэнка з Фірсавым.

Значыць, і вы спазналі замірэнне
І даравальнае прабачэнне,
нібыта Платон Каратаеў,
калі па вашай спіне катаючыся
свяшчэнна дзейнічаў венічак...

О колькі, колькі тваіх рэалістаў,
айчынная літаратура,
адпарыла, адхвастала,
ачысціла —
сандуноўская верхатура!

Скажыце, вы адчулі па стылю,
што за фігура лазеншчык-блазан?
Вялікім артыстам
быў Сандуноў Сіла,
калі выдумляў Лазні!

І зараз у парыльні запаветнай ярасна
увесь мужчынскі Вялікі Тэатр парыцца,
Праўда, іронія лёсу, Мікалаевіча,
як артыста,
забылі начыста!

О не! У Сандуноўскіх не забаўляюцца,
уласна!
Дух ачышчэння, адкідвай маску!
Дух апрашчэння,
уладар, калі ласка! —
як у Сандуноўскіх Лазнях...

Галгофа

Не! Абыякава і проста
я не магу глядзець на подласць.
Дзе топчуць чалавека годнасць, —
не сведка я... Не крыж на ростань...

А той, хто да крыжа прыбіты,
ён смела кінуў выклік ночы.
Зніжаецца выдзёўбваць вочы
крумкач значэлага нябыту.

На трасах, што крыжуюць кулі,
напішуцца радкі і строфы,
як гнеў Талстога.
Каб пачулі,
патрэбна гаварыць
з Галгофы.

ВЫДАННІ

Генрык Жавускі — вядомы польскі пісьменнік-рамантык XIX стагоддзя, сучаснік і сябра Адама Міцкевіча. Яго раман, які складаецца з серыі апавяданняў ***"Успаміны пана Севярына Сапліцы, парнаўскага падчашага"***, выдадзены на беларускай мове ўпершыню. Гэта гістарычны твор, у якім выведзены каларытныя тыпы прадстаўнікоў наваградскай шляхты. Сярод іх такія вядомыя асобы, як Тадэвуш Рэйтан, Караль Радзівіл "Пане каханку". Раман выйшаў у выдавецтве "Лімарыус" у перакладзе *Міхася Кенькі*. Прадмову да твора напісаў *Аляксандр Фядута*.

Чарговая кніжка вершаў ***Георгія Ліхтаровіча "Ліхтарыкі"*** (выдавецтва "Юніпак") пераканаўча даказвае, што сапраўдная паэзія можа быць не толькі дасканалай па форме, глыбокай па думцы, афарыстычнай. Гэты зборнік прасякнуты тонкім пачуццём гумару, самаіроніяй.

Размерана-стрыманая, без рэзкіх нежыццястойкіх наватарскіх хістанняў паэзія дваццацігадовага ***Рагнеды Малахоўскага*** — крыніца яго асабістай праўды жыцця. Творы, змешчаныя ў зборніку ***"Беражніца"*** (выдавецтва "Мастацкая літаратура") адрозніваюцца шчырасцю і светлым наівам, лірычнасцю і гарманічнасцю пачуццяў.

Аляксандр Суслаў у паэтычнай трыядзе ***"Корень жизни"*** (выдавецтва "Парадокс") паказвае сябе як трыбун, лірык і філосаф. Палітра яго вершаў настолькі разнастайная, што ствараецца ўражанне, быццам напісаны яны рознымі людзьмі. Творы трывожаць памяць і душу, вучаць любові да бліжняга, прымушаюць думаць пра вечнае.

"Пальновы вецер" працягвае цыкл раманаў, у які ўваходзяць "Шчыглы", "Паводка сярод зімы", "Дзікая ружа", "Сіняе лета", "Бесядзь цячэ ў акіян". У новым творы апісваюцца падзеі 1991 года, калі разбурыўся Савецкі Саюз, Беларусь набыла Незалежнасць. Пасля Чарнобыля прамінула пяць гадоў. Некаторыя мае героі засталіся жыць у адселенай вёсцы. І мая родная вёска Клеявічы, што ў Касцюковіцкім раёне на Магілёўшчыне, апынулася ў зоне адсялення. Раман друкуе часопіс "Полымя" у 3—4 нумарах.

Аўтар

Пальновы вецер

Леанід ЛЕВАНОВІЧ

Пасля няўдалага палявання жыццё Косці Вароніна пайшло пад адхон, нібы снег са страхі вясною — шух і аб'ехаў долу. А яму сёлета споўнілася ўсяго толькі пяцьдзесят гадоў. Залаты юбілей. Жыць бы яшчэ ды жыць. Але з усіх бакоў сыпаліся непрыемнасці, як з сеялкі сыплецца зерне ў свежую раллю. Дык зерне давала ўсходы, поле каласавала, красавала, дыхала цёплым водарам хлеба, радавала вока. Давала чалавеку жыццёвую сілу.

Косця ж, наадварот, з кожным днём усё мацней адчуваў, як стома, быццам мядзведзь, навальваецца на яго, злосць на людзей, на суседзяў, на жонку, і асабліва на хаўруснікаў па няўдалым паляванні, перапаўняла ягоную істоту.

Злосць, крыўда і нянавісць раз'ядалі Косцеву душу, быццам ракавыя метастазы. І найбольшая крыўда была на Івана Сырадоева, і нянавісць выспявала найперш да яго. З маленства памятаў, як Сырадоеў заходзіў да іх у форменным, колеру балотнай жабы шынялі і такога ж колеру фуражцы, крычаў на матку: чаму не плаціш падаткі, страхоўку, самаабкладанне, пазыку? Нянавісць набухала, як цеста ў дзежцы, калі згадваў, як распякаў яго, Косцю, старшыня сельсавета Іван Сырадоеў на партыйных сходах за п'янку.

І выходзіла, што галоўны віноўнік Косцевага няшчасця, гэта ён — старшыня сельсавета Іван Сырадоеў, хай сабе ўжо былы, але ж віну за няўдалае паляванне, ці, як усе гавораць, за браканьерства, узяць на сябе ўгаварыў Косцю менавіта ён, абяцаючы выплаціць штраф. А цяпер ад сваіх слоў адмаўляецца: мая хата з краю, нічога не знаю.

Лютая нянавісць успыхнула пасля таго, як Сырадоеў і Бравусаў пабілі Косцю, пужалі, каб пра іх нідзе не ўспамінаў, каб нікому не жаліўся. І ў Косцевай душы выспявала помста.

Штодня Косця блукаў па лесе. Неяк убачыў дзятла — той апантана малаціў дзюбаю, аж рэха кацілася па лесе. Іншых гукаў не было чуваць. Змрочны, насуплены, прыцярушаны снегам, лес быццам драмаў і чакаў Новага года. Пасля яго сонца пачне хадзіць вышэй, снегавыя падушкі з галінак зваляцца, лес уздыхне вальней, устрапянецца і будзе чакаць вясны.

Косцю Новы год не абяцаў нічога добрага. Судовы выканаўца прыедзе з участковым, апішуць маёмасць, забяруць карову. Аксеня будзе галасіць на ўсю вёску. А што рабіць Косцю? З сякераю ці са стрэльбаю бараніць свой набытак. А дзеля каго? Дзяцей няма. Каханне да Ксені даўно развеялася, як дым. Не, у турму Косцю не хацелася. Але і жыць таксама не было жадання. Душа не мела свабоды і волі. Мацней за ўсё было ў ім жаданне адпомсціць, а там, што будзе, тое і будзе. Адзін патрон ён пакіне для сябе...

Блукаючы па лесе, Косця выношваў план помсты. Дзе можна перастрэць Сырадоева? Куды ён ходзіць? Дзе бывае? От, каб ён выправіўся ў лес, але адзін ён не ходзіць. Падпільнаваць, калі будзе ісці па вёсцы. Людзі ўбачаць. Гэтага не баяўся, адно, каб не перашкодзілі здзейсніць задуманае. Ён павінен адпомсціць. А там — Бог — бацька...

Пра Бога Косця думаў рэдка. Царквы ў Хатынічах не было. Пры Хрушчове зачынілі храм у Саковічах, але разбурыць магутную камяніцу не хапіла духу ў мясцовых ваяўнічых атэістаў. Затое драўляную царкву ў Белай Гары разабралі на дровы для клуба і фермы. Пасля Чарнобыля старэйшы люд пацягнуўся да Бога, шукаючы падтрымкі і надзеі на збаўленне ад нечысці. Пачалі гаварыць, што Чарнобыль — гэта Боскае пакаранне за грахі. Па тэлевізары Косця на свае вочы бачыў, як стаялі са свечкамі ў руках былыя партыйныя босы, і яму карцела плюнуць на экран.

Сын паліцэйскага, былы лепшы механізатар раёна, перадавік-брыгадзір, былы камуніст Косця Варонін не любіў двурушнікаў, пярэватняў, падманшчыкаў. Менавіта падман Івана Сырадоева і Сямёна Чукілы злаваў яго асабліва. Вы ж кляліся, бажыліся, што паможаце выплаціць штраф цалкам, а цяпер пакінулі яго аднаго. І таму Косця ўсё больш пераконваў сябе, што мае права на помсту. Мае права пакараць людзей-здраднікаў, хлусаў. Бацька ягоны служыў немцам, дык і паехаў з імі, не перакінуўся да партызанаў, не кляўся бальшавікам у вернасці.

Апошнім часам Косця ўсё часцей згадваў бацьку. Можа таму, што Ніна, родная Косцева сястра, раіла напісаць бацьку пра сваю бяду, папрасіць дапамогі. А Косцю было сорамна, бо зімою Нінка сказала: "Давай напішам бацьку пісьмо разам. Павіншуем. Яму семдзесят гадоў". — "Напішы сама. І ад мяне перадай прывітанне", — адмахнуўся Косця. Цяпер ён дакараў сябе, што не паслухаўся сястры, што і раней ні разу не напісаў бацьку ліста. А Нінка віншавала яго амаль штогод. І атрымлівала лісты, у якіх бацька перадаваў паклоны і Косцю, і Данілу.

Лісты гэтыя Ніна хавала, бо Даніла не ўхваляў сейную перапіску з бацькам-паліцаем, бо яго, старшыню калгаса, за гэта могуць выклікаць у райкам партыі. Косця райкама не баяўся, але так ні разу і не напісаў бацьку.

* * *

Можа, таму, што часцей думаў пра бацьку, ён пачаў сніцца, чаго раней не было. Аднойчы прыснілася: бацька і ён косяць дзялку, якую адмералі ім на "працэнты". Спачатку ўзяліся таптаць мяжу ад суседзяў. Уторкнулі высокія лазовыя віткі, завязаўшы вецце кучомкаю. "Стой, трымай вітку, каб вецер не зваліў, а я мяжу прайду", — сказаў бацька. Быў ён у белай кашулі ў сінія палоскі, у палінялых джынсах, запраўленых у высокія боты, падобныя на нашы кірзачы. На галаве капялюш з шырокімі палямі, як самбрэра ў каўбояў. Бацька зайшоў з другога канца дзялкі, уткнуў гэткую ж высокую вітку і павольна, кароткімі крокамі ішоў насустрач Косцю — таптаў мяжу. Іхняя дзялка ўпіралася ў купчасты лазовы куст, за ім была парослая асакою шырокая лужына.

Калі бацька наблізіўся да Косці, з-за куста выйшаў Іван Сырадоеў. У руках ён трымаў скручаны ў трубачку школьны сшытак, за вухам тырчаў чырвоны аловак. Быў ён у палінялай клятчастай кашулі, на галаве выгаралая ад сонца кепка, насунутая на лоб. "Дзень добры, Іван Ягоравіч!" — здаля павітаўся бацька. "Здароў, Сцяпан Восіпавіч! З прыездам цябе! У адведкі ці насаўсім?". "У адведкі. Во, памагу накасіць сена, дый паеду. Прабач, Ягоравіч, але ёсць пытанне. Што ты крыўдзіш маю жонку? Паласу адвёў з кустоўем. Ты, калі ласка, стаўся да Просі і да Косці па-добраму, па-людску". "Паласу надбавілі ўшыркі, Восіпавіч. Камісія ўлічыла куст і лужу. Так што, ты дарэмна кажаш пра нейкую крыўду. Ты лепш раскажы, як табе жывецца там, у Амерыцы?". "Ого, браток, гэта доўгая песня. Жыццё і ў Амерыцы няпростае і нялёгкае. Праўду людзі кажуць: добра там, дзе нас няма... Я жыву ў Аргенціне. Ета Паўднёвая Амерыка. Злучаныя Штаты ад нас вельмі далёка. Спярша, Ягоравіч, было мне дужа цяжка. Мовы не ведаў. Без слова ў роце, без граша ў кішэні паявіўся там. Клімат у нас не такі, як у Беларусі. Гарачыні болей, сонца смаліць мацней". "Неяк кіно глядзеў пра вашу краіну. Вялізныя статкі жывёлы. Пастухі на конях. У такіх брылях шырокіх, як у цябе, Восіпавіч". "Праўда, у нас вялізныя прасторы. Стэпы называюцца пампай. Жывёла пасецца круглы год".

Косця слухаў і радаваўся, што бацька і мясцовы начальнік Сырадоеў гутараць прыязна, па-суседску, што між імі няма ніякай варажнечы. На развітанне Сырадоеў сказаў:

— Тут во каля куста трава густая, высокая. Асака пракідаецца. Каровы маладую асаку ахвотна ядуць. Толькі троху солі трэба пасыпаць. Ну, калі будзеце ўкладваць на сенавал. Ты, Сцяпане, можа, пра ета і забыўся, а Косця павінен ведаць. Ды і Прося — таксама.

Сырадоеў, як з'явіўся нечакана, так і знік раптам за кустам. А Вароніны ўзяліся касіць. Бацька ішоў паперадзе, быццам паказваў сыну, як трэба шчытна выкошваць сваю дзялку — працэнты ўсе выгрызалі дужа старанліва, кожную купіну абкошвалі пад нулёўку. Косця махаў касою і душа яго радавалася, што прыехаў бацька. Яму ад радасці ажно хацелася плакаць. Яны ўжо дакошвалі паласу, калі раптам з-пад куста выпаўзла вялізная гадзюка і з шыпеннем кінулася на Косцю. Ён закрычаў, з усяе сілы замахнуўся касою і — прачнуўся. Вочы яго былі вільготныя... Ляжаў у цішы, чуючы, як тахкае за грудзінаю сэрца. У роце ўсё сасмяглА. Басаногі пратэпаў на кухню, засіліў конаўку вады, прагна выпіў. Калі зноў умасціўся на ложку, падала голас Аксеня:

— Не спіш, Косця? Нешта ты крычаў у сне.

Косця прыўзняўся на ложку і расказаў жонцы ўбачаны сон.

— Каб жа не твая глотка лужоная. Сабралі б грошай, мог бы з'ездзіць да бацькі. Цяперака ж можна. А то і ўдваіх бы паехалі. Дык жа свету белага не бачыш праз гарэлку.

— Ксеня, ну ты ж разумееш... Не ва ўсім я вінаваты. Так у нас жыццё склалася. А з паляваннем падвялі. Падманулі. Ну, не лезці ж мне жывым у магілу.

— Косця, мілы. Я ж пра ета не кажу. Не бяры ўсё да галавы.

Аксеня лягла з ім побач. Мабыць, яе вельмі ўразілі словы: "Не лезці ж мне жывым у магілу". Яна прасунула цёплую руку пад Косцеву галаву, прыхінулася ўсім целам. Косця адчуў знаёмы і родны пах жончыных валасоў, грудзей, пачаў асцярожна яе гладзіць, чуючы заскарузлай даланёю мяккасць і гладкасць скуры вышэй каленяў. Рука саўганулася вышэй, пяшчотна дакранулася да тугога цёплага жывата, у якім так і не зарадзілася новае жыццё. Жонка прытулілася шчыльней, цмокнула яго ў няголеную шчаку. Косця адчуў даўно нязведаную хвалю пяшчоты, вельмі захацелася блізкасці, але нічога ў іх не атрымалася. Тады Косця пачаў горача, прагна цалаваць Аксеню.

— Адпіў ты, Косцічак, сваю мужчынскую сілу, — уздыхнула Аксеня.

— Гэта не ад п'янкі.

— А ад чаго ж?

— Ад працы цяжкой. Ад харчу слабога. З малых гадоў укалываў. То на плугах, то на трактары, то на камбайне. З цёмнага да цёмнага. А бывала, і ноччу — араў. Без выхадных, без водпуску. А тут яшчэ радыяцыя звалілася, як снег на галаву.

— Хіба іншыя трактарысты не працуюць? Усім хапае радыяцыі.

— Былі ў мяне тры шчаслівыя гады. Калі служыў у арміі. Адна была бяда. Вельмі да дзевак хацелася, — усміхнуўся Косця. — І з табою першыя гады... Асабліва першы, мядовы. Ты ж сама казала, што ў нас не месяц, а цэлы год мядовы. Толькі потым пачалі бедаваць, што няма ў нас...

— Праўда, Косцічак. Я ета помню. Успаміны пра першы год грэюць мяне ўсю жысць. Ну, не перажывай. Неяк жа выберамся з етай ямы. Яшчэ ж не старыя. Будзем жыць. Каторы ж ета час? — Аксеня пстрыкнула выключальнікам, пад столлю ўспыхнула яркая лямпачка без абажура. — Тры гадзіны. Яшчэ рана. Сянні ж субота. Можна пазней паспаць.

Яна сцішылася і неўзабаве заснула. А Косця так і пракачаўся да раніцы. Цяжкія думкі варочаліся ў галаве, нібы камяні ў жорнах. Як памянялася жыццё! І парторгаў няма, і Савецкага Саюза няма. А для Косці жыццё не палепшылася, а наадварот — зрабілася невыносным. І з кожным днём горай. І ў ложку здатны адно на пацалункі.

Не ведаў Косця Варонін, што гэтаю ноччу цалаваў жонку апошні раз.

* * *

Па абедзе ён выбраўся ў краму. Каля яе тоўпіліся падвяселеныя мужчыны. Быў між іх і Сырадоеў, таксама расчырванелы, ён пра нешта апавядаў, размахваючы рукамі. Мужчыны слухалі, рагаталі. Злосць і нянавісць з новай сілай успыхнулі ў Косцевай душы. Рукі сутаргава сціскаліся ў кулакі. Здаецца, кінуўся б на яго, быццам каршун. Косця даў "дзеньдобры", прайшоў міма. "Прыхапі фауста і на нашу долю, Косця!" — крыкнуў нехта.

Ён купіў два боханы хлеба, пляшку віна і хуценька выкуліўся з крамы. Мужчыны зноў нешта крычалі яму, але ён не азірнуўся, нібыта і не чуў. У яго білася адна думка: "Ты сянні ў мяне парагочаш! Толькі б паспець! Толькі б ніхто не перашкодзіў..." Дома ён паклаў хлеб на стол, як і нёс у чырвонай сетцы, адкаркаваў віно, каўтнуў некалькі гыткоў, потым ускінуў на плечы двухстволку, паверх кухвайкі ўсцягнуў цёмны плашч, каб схаваць стрэльбу. У кішэню ўкінуў чатыры набоі, кулявыя, як на лася, у другую запхнуў недапітую пляшку. І па загуменні рушыў да крамы. Метраў за дзвесце ад яе схаваўся за тоўстай вярбою.

Вакол было ціха, адно шумеў пругкі халодны вецер у бязлістых кронах. Браўся марозік. Ад калючага ветру Косцю засцерагаў тоўсты камель дрэва. Раптам пачуў крокі. Ад крамы сунуліся тры постаці. Сэрца ёкнула: нават калі між іх ён, ягоны крыўднік, нічога не атрымаецца, бо можна параніць нявіннага. Мужчыны прыстоілі, развіталіся. Двое павярнулі налева, адна постаць сунулася да аўтобуснага прыпынку. Косця ўвесь наструніўся з галавы да ног; здаецца, ператварыўся ў слых і зрок: не памыліцца, пераканацца, што гэта Ён.

Постаць набліжалася. Ішоў чалавек нетаропка, накулыгваючы. Значыць, Ён! У апошнія гады Іван Сырадоеў пачаў трохі кульгаць, бо шмат давялося пахадзіць па вёсках былому фінагенту. Косця падрыхтаваў стрэльбу, саўтануў наперад шурпаты язычок засцерагальніка. Пра сябе, што будзе з ім пасля стрэлу, не думаў. Галоўнае — адпомсціць крыўдніку. Праз хмары выбіўся краёк месяца, а потым вылузнулася ва ўсёй першароднай красе жаўтлява-белая поўня. Пры святле месяца Косця пераканаўся — гэта Сырадоеў. Пачуў, як шуміць, пульсуе ў скронях кроў, мацней прыхінуўся да вярбы, каб яго загадзя не згледзеў крыўднік. Сырадоеў прамінуў вярбу, тады нечакана пачуў:

— Іван Ягоравіч! Пачакай, — нягучна прамовіў Косця, і сам не пазнаў свайго голасу. І падалося яму, што крыкнуў на ўсю вёску.

Сырадоеў рэзка, спалохана павярнуўся, памкнуўся быў схавацца за дрэва, але Косця апярэдзіў — бабахнуў стрэл, за ім — другі.

— Вось табе за лася! За падман. За ўсё астатняе. Мой прысуд!

Сырадоеў, мабыць, ужо не пачуў гэтых слоў. Ён скурчыўся, застагнаў і асеў долу.

Косця кінуўся бегчы, пятляючы, нібы заяц, між дрэў. Азірнуўся — на аўтобусным прыпынку і на дарозе нікога не было. Ён выбег на сцежку, якая праставала праз сад на Хатыніцкі бальшак. Бег, пакуль не пачаў задыхацца.

У Косцевай душы пачыналася бура. Куды бегчы? Можа, павярнуць дамоў? Ніхто не бачыў, як ён страляў. А раптам Сырадоеў выжыве, выдасць яго. Дык усе і так зразумеюць, зробяць экспертызу: з двухстволкі нядаўна стралялі, калібр падыходзіць. Пачнецца следства, суд і... вышка. Прыплюсуюць браканьерства. Не, дамоў вяртацца не выпадала.

Ён стаяў, абняўшы старую яблыню, усё мацней чуў у нагах вялікую стому і слабасць, сэрца цяжка тахкала за грудзінаю. Холад дабіраўся да ўзмакрэлай спіны — успацеў, калі бег ад вёскі. Косця перазарадзіў стрэльбу, заклаў два набоі — руля клацнула, заціснуўшы патроны, нібы ўзрадавалася новай порцыі смяротнага грузу. "Мне хопіць аднаго, — варухнулася думка. — А другі, можа, для Бравусава? Каб рук болей нікому не ламаў. Не, хай жыве. Чуў ад Ксені, што Марына Сахута знайшла з ім шчасце. "Успыло ў памяці, як частаваў Бравусаў малога Косціка цукеркамі. Калі стаў дарослым, Косця зразумеў, што ўчастковы ездзіць да іх не так сабе. Аднойчы ён падгледзеў, як маці цалавалася з Бравусавым.

І ўсё ж Косця пасунуўся ў бок Хатынічаў. Спярша крочыў па дарозе — тут пасля Чарнобыля паклалі асфальт, а потым павярнуў улева, да фермы. Але і туды заходзіць яму не хацелася. Стаяць ці сядзець не мог, карцела легчы. Ён узгадаў, што за фермаю на лузе, стаіць стог сена.

* * *

Ён абышоў ферму злева, далей ад вёскі. Тут рос малады, густы, як шчотка, хвойнік, быў неглыбокі, разложысты раўчук. Вясною тут бурліла і клекатала талая вада, улетку раскашавала густая, як воўна, трава. Некалі стары Арцём, Аксенін бацька, расказаў Косцю, як у сорак трэцім паказаў чырвонаармейцам, дзе лаўчэй фарсіраваць Бесядзь, прапаўзці па лузе, праз гэты раўчук абысці Хатынічы, прабрацца ў тыл. Там салдаты акапаліся за нізкімі альховымі кустамі. І вось на золку з крыкамі "Ура!" асноўныя сілы пайшлі ў атаку. Немцы ўмацавалі Хатынічы, бо вёска прыкрывала Саковіцкі гасцінец, па якім адступалі іншыя вайсковыя злучэнні. Тады і секанулі кулямёты з тылу. Манёўр у абход вырашыў лёс той аперацыі, збярог дзесяткі савецкіх воінаў.

(Працяг на стар. 14)

Арт-пацеркі

Наш выдатны музыкант, піяніст-віртуоз, народны артыст Беларусі, прафесар Ігар Алоўнікаў узнагароджаны медалём Францыска Скарыны. Так адзначаны яго асабістыя значныя дасягненні ў музычным мастацтве. Адпаведны ўказ падпісаны Прэзідэнтам РБ.

Міжнародны фестываль гітарнай музыкі "Менестрэль" прайшоў у Віцебску. Сёлета гэта традыцыйная імпрэза сабрала пераважна беларускіх гітарыстаў.

На фестывалі "Мінская вясна" ў Вялікай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі: 8 красавіка — Акадэмічны сімфанічны аркестр РБ з дырыжорам Ч.Ансбахерам (ЗША) і салістам-скрыпачом Д.Гершовічам (Манака); 10-га — музыка

Ф.Шапэна ў выкананні І.Алоўнікава; 12-га ансамбль "Харошкі" прэзентуе праграму "Добры вечар, госці!".

Малая зала імя Р.Шырмы, якая з'явілася ў абноўленым будынку БДФ, запрашае на бліжэйшы канцэрт "Мінскай вясны": 14-га тут — беларускія выканаўцы, лаўрэат міжнародных конкурсаў віяланчэліст А.Дулаў і заслужаны артыст РБ піяніст Ю.Гільдзюк. У Зале камернай музыкі, што на Залатой Горцы, 8 красавіка грае наш арганіст К.Шараў; 11-га — харавыя калектывы Рэспубліканскага каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі "Званочкі" і "Спяваючыя музыканты" пад кіраўніцтвам А.Мазуравай; 14-га — Ансамбль салістаў БДФ пад кіраўніцтвам І.Іванова.

Лекторый выхаднога дня ў Нацыянальным мастацкім музеі РБ ладкуе чарговыя сустрэчы. 9 кра-

савіка тэмай "Сусвет, пабудаваны па законах прыгажосці. Мастацкая культура эпохі мадэрна" тут распачынаецца серыя лекцый, прысвечаных мастацтву XX ст. А 10-га ў праграме лекторыя — "Постімпрэсіянізм. Поль Сезан і Анры дэ Тулуз-Латрэк".

С.ВЕТКА

Фота забяспечана аўтарам

Абуджэнне праз музыку

Чароўныя гукі старажытнага аргана луналі пад скляпеннямі барочнага касцёла і заціхалі недзе ў закутках доўгай навы. На нейкі момант здавалася, што ажывалі анёлы на фрэсках, а позірк святых з абразоў рабіўся цяплейшы і па-чалавечы прыязны. Уласная істота быццам раствараласа ў паветры і разам з чулай і пяшчотнай мелодыяй узнімалася ў паднябессе... Ці не добры чараўнік той, хто прымушае гэтую маўклівую глыбу трубачак ды клавішаў плакаць і смяяцца, грозна грымець і мілагучна спяваць?

Я зазірнула ў "майстэрню чарадзея" і пагутарыла з ім — Валерыем Шматам, сталічным музыкантам, арганістам касцёла святых Сымона і Алены, мастацкім кіраўніком двух хораў і проста таленавітым чалавекам.

— Скажыце, калі ласка, адкуль у вас захапленне менавіта арганам, а не нейкім іншым, больш распаўсюджаным і звыклым музычным інструментам?

— Арган звязаны з маімі дзіцячымі ўспамінамі, калі я ўпершыню, яшчэ хлопчыкам, іграў на гэтым вялізным інструменце. Яго веліч, спрадвечнасць сапраўды ўражваюць і не даюць застацца абыякавым. Дакранаючыся да яго, нібы датыкаешся да самой гісторыі, яднаешся з тымі, хто граў на ім раней.

— А дзе вы працавалі арганістам раней, пакуль не трапілі ў Чырвоны касцёл?

— Амаль 10 гадоў таму я прыехаў у Мінск з роднай Стаўбцоўшчыны і паступіў у музычнае вучылішча імя М. Глінкі. Потым пачаў працаваць арганістам у Архікатэдральным касцёле. У кансерваторыю я паступаць не збіраўся і сур'ёзна разважаў наконт таго, каб прысвяціць сваё жыццё Богу і людзям. Урэшце, усё ж такі падаў дакументы ў Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі за тры дні да ўступных іспытаў. І паступіў! Падчас навучання быў запрошаны ў якасці саліста на запіс парафіяльнага хору касцёла св. Сымона і Алены "Голас душы". Праца вельмі спадабалася, я адразу адчуў блізкае і знаёмае мне. І, дзякуючы запрашэнню ксяндза-пробашча Уладзіслава Завальнюка, я ўжо больш як 5 гадоў іграю на аргане ў Чырвоным касцёле.

— Вы ж таксама з'яўляецеся мастацкім кіраўніком двух хораў. Распавядзіце, калі ласка, пра свой чын хормайстра.

— Так, "на маіх плячах" цяпер два мужчынскія хоры: парафіяльны "Арханёл" і Канцэртны хор Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

"Арханёл" — гэта мой першы калектыў: можна сказаць, што разам з ім на працягу пяці гадоў сталеў і я, набіраўся досведу, удасканальваў майстэрства. Мы ўдзельнічалі ў фестывалях "Магутны Божа", "Lapski Te Deum". Складанасці, безумоўна, былі з дысцыплінай, бо трэба навучаць хлопцаў не толькі спяваць, але і быць адказнымі за агульную справу, заклікаць да актыўнага ўдзелу ў штодзённым жыцці хору, у тым ліку і ў рэпетыцыях. Цяпер у мяне ёсць памочнік па кіраванні "Арханёлам", хаця і па-ранейшаму асабіста кантралюю рэпертуар, дырыжырую падчас выступленняў.

Што датычыць прафсаюзнага калектыву, дык сёння гэта мая асноўная праца, якой я прысвячаю амаль увесь свой час. На працягу навучання ў Акадэміі музыкі я хацеў стварыць хор такога кшталту. І нарэшце, пры канцы пятага курса, ідэя ўвасобілася ў канкрэтны план дзеяння. Я меў добрыя рэкамендацыі ад свайго настаўніка па дырыжыраванні — Віктара Роўды, таму з прапановай стварэння хору я смела звярнуўся ў Федэрацыю прафсаюзаў. Старшыня федэрацыі, Леанід Козік, падтрымаў мяне, але задаў адзінае пытанне: "А чым ён будзе адрозніваціца ад іншых?".

Адметнасцю новага калектыву зрабілася тое, што складаецца ён з маладых хлопцаў і мы маем новы рэпертуар, з якім імкнёмся выступаць на вялікіх пляцоўках. Сваёй працай намагаемся зрабіць так, каб слова "хор" не адпуджвала слухачоў, а каб ім было цікава і прыемна пачуць нашыя спевы. Для гэтага мы спалучаем акадэмічны вакал з пэўнымі электроннымі элементамі ў суправаджэнні. Атрымліваецца нешта падобнае да стылю гуртоў "Era" ці "Enigma". Але хор шматжанравы, і мы не засяроджваемся на чымсьці адным. Мы спяваем песні на патрыятычную тэматыку, творы народаў свету, песні з кінафільмаў, не абмінаем эстрадны шлягер, а калі-нікалі гучаць ноткі, падобныя да манеры выканання "Песняроў". Але ўсё гэта знітоўваецца духоўнасцю, якую я імкнуся ўлучыць у дзейнасць і гэтага свецкага калектыву.

Праца ў двух маіх хорах мае, безумоўна, шмат агульнага, але і адрозненні відавочныя. Сёй-той кажа, што нельга распыляцца і так мяне надоўга не хопіць. Не ведаю, пабачым. Пакуль магу сказаць толькі тое, што я ў творчых пошуках сваёй асабістай нішы ў музыцы. Якой жа яна будзе — пакажа час.

— Ведаю, што вы таксама пішаце ўласныя творы. Дзе можна іх пачуць?

— Я не толькі ствараю ўласныя кампазіцыі, але і раблю аранжыроўкі, пішу тэксты песень. З хорам прафсаюзаў мы, напрыклад, пачалі рыхтаваць рэлігійныя творы да фестывалю духоўнай музыкі, сярод якіх дастаткова маіх уласных. Ёсць таксама ў рэпертуары і мая свецкая музыка, напрыклад, "Замкі Беларусі". На вершы цудоўнага паэта Ігара Севяраніна я напісаў музыку, і атрымалася песня "Не завидуй другу". З новых прац — аранжыроўка песні Леаніда Захлеўнага пра Дзеда Барадзеда, пад якую калісьці кляліся спаць амаль усе дзеткі нашай краіны. Часам мяне крытыкуюць за тое, што ўключаю ў рэпертуар хору шмат сваіх твораў. Але нашаму калектыву часта бракуе эстрадных кампазіцый, таму даводзіцца ствараць іх самому. Быў бы вельмі ўдзячны тым, хто пажадаў бы супрацоўнічаць з намі. Тады б атрымлівалася значна цікавей, бо кожны чалавек уносіць нешта новае, асабістае і адметнае.

— Дзе ж знаходзяцца вытокі вашага натхнення для такой напружанай і плённай творчасці?

— Цяжка сказаць. Галоўны штуршок для мяне заўсёды ідэя, якую я потым увасабляю з дапамогай музыкі. Ноты, гукі — гэта для мяне толькі своеасаблівы сродак, які робіць маю думку рэальнасцю. Ідэі ж часцяком проста "ляжаць пад нагамі", з'яўляюцца ў штодзённым жыцці. Вандроўкі ў лес, у грыбы; люлянне сына... Падчас летняга адпачынку ідэй было столькі, што даводзілася занатоўваць іх, інакш я не запомніў бы ўсе. Для мяне таксама цікава спрабаваць напісаць тое, што хацелі б пачуць людзі, якія не з'яўляюцца музыкантамі. Цікава зразумець, як яны бачаць свет, як успрымаюць музыку, каб больш дасканала перадаць ім свае ўласныя пачуцці і задаволіць іх эстэтычныя памкненні.

— Адчуваецца ў вашай творчасці, асабліва ў першым аўдыёальбоме, моцны грыгарыянскі ўплыў. Што вас так прываблівае ў ім?

— Увогуле, толькі спеў без суправаджэння музычных інструментаў, да якога адносіцца і грыгарыянскі, раней быў ва ўсёй Царкве. Лічылася, ды так яно і ёсць, што чалавечы голас сам па сабе — найдасканалы з музычных інструментаў. Спрэчкі наконт выкарыстання іх падчас набажэнстваў вяліся да X стагоддзя і ўрэшце Царква Заходняга абраду вырашыла дазволіць ужыванне аргана. Праваслаўе ж і сёння забараняе выкарыстоўваць на літургіі ўсялякі музычны інструмент. Але і пазней у маленькіх каплічках каталіцкія манахі спявалі без аргана. Адсюль, дарэчы, і пайшла назва "акапэла" (capel з лацінскай — капліца). Увогуле, аднагалосны спеў — адзін з сімвалаў еднасці Царквы, імкнення быць непадзельным цэлым. І тым больш велічна і пранікнёна, як мне падаецца, гучыць менавіта мужчынскі грыгарыянскі спеў. Да таго ж, менавіта ён мае сёння найбольшую запатрабаванасць і папулярнасць.

— Што ж вы імкнецеся данесці слухачам праз свае творы?

— Асноўнае, напэўна, — духоўнае выхаванне, своеасаблівая адукацыя праз музыку і абуджэнне патрыятычных пачуццяў. Найперш я намагаюся наблізіцца да слухача непасрэдна праз аповед пра твор перад яго выкананнем. Такая кароткая анатацыя дапамагае настроіцца на слуханне, зразумець тагачасную эпоху, калі твор старажытны, пачуць усё тое, што аўтар хацеў сказаць музыкай, уявіць сабе пачуцці, якія кіравалі ім, і сітуацыю, звязаную з напісаннем кампазіцыі. Гэта вельмі важна, бо часта здараецца так, што чалавек, не маючы ніякай музычнай адукацыі, не можа проста зразумець усяго. Я спрабую зрабіць так, каб слухачы далучаліся да невычэрпнай крыніцы хараства больш поўна, і тут ужо мой клопат, як гэтага дасягнуць. Немалаважна для мяне праз музычныя творы несці і любоў да Бацькаўшчыны, своеасаблівы "неапатрыятызм", паказваць прыгажосць нашай краіны, яе багаты фальклор і драматычную гісторыю. Упэўнены, усё гэта не можа быць незаўважана слухачом.

— А з якімі музыкантамі вы падтрымліваеце творчыя сувязі, якія творы сучаснікаў найчасцей трапляюць у рэпертуар?

— Вельмі люблю і паважаю я творчасць маэстра Міхася Дрынеўскага, кампазітараў Аляксандра Літвіноўскага, Вячаслава Кузняцова, Мікалая Літвіна, Леаніда Захлеўнага. Выдатны меладыст Ігар Лучанок, яго кампазіцыі выклікаюць у мяне сапраўднае захапленне.

— Ці не падзеліцеся сваімі творчымі планамі?

— З "Арханёлам" я б хацеў цалкам запісаць літургію Каталіцкага Касцёла, якая толькі нядаўна была цалкам перакладзена на беларускую мову, — каб людзі далучаліся да духоўнага здабытку нашага народа. А з Канцэртным хорам Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі планую запісаць першы альбом і зрабіць шэраг тэматычных праграм, такіх, напрыклад, як гістарычна-духоўную, прысвечаную творам народаў свету ды інш. Маем і шоу-гурт з дзевяці чалавек, якія маглі б выступаць з уласнай эстраднай праграмай асобна. Спадзяюся, усё гэта ў хуткім часе адбудзецца.

Ларыса ДАРАШЭНКА

Фота К. Дробава

З дня нараджэння Лазара Хідэкеля мінула 100 гадоў... Нягледзячы на тое, што нарадзіўся ён у Віцебску, яго імя не знойдеш ні ў "Гісторыі беларускага мастацтва", ні ў айчынных даведніках па архітэктуры. Ды і ў расійскім рэйтынгу імя гэтага творцы займае даволі сціплае месца. У той час, як настаўнікі і бліжэйшыя сябры Лазара Хідэкеля, прынамсі, Марк Шагал і Ілля Чашнік, пазначаны катэгорыямі "сусветна вядомы творца" ці "мастак-прафесіянал з адметным почыркам" (Единый художественный рейтинг (Вып. 5, номинация «Живописцы и графики», т. 3), ён сам прадстаўлены адно толькі як "прафесійны мастак з творчым патэнцыялам, які мае перспектыўную адзнаку спецыялістаў"(?!)... Але чаго насамрэч вартыя гэтыя папулісцкія іерархіі, усім вядома.

Талент. Памяць. І загадкавыя фальшыўкі

Сусветная мастацкая грамадскаць імя Лазара Хідэкеля найбольш выразна прыгадала, напэўна, у 1992 годзе падчас правядзення у Музеі Гугенхейма выставы "Вялікая Утопія". Менавіта ў гэтай экспазіцыі больш як праз паўстагоддзя творы Хідэкеля зноў апынуліся побач з кампазіцыямі К.Малевіча, Р.Фалька, М.Шагала, А.Родчанкі, з якімі ён некалі ўдзельнічаў у "Першай дзяржаўнай выставе карцін мясцовых і маскоўскіх мастакоў" у Віцебску. Да паступлення ў мастацкую школу, адкрытую Маркам Шагалам у Віцебску, Лазар Хідэкель скончыў мясцовую гімназію. Менавіта ў майстэрні Шагала ён упершыню пачаў пісаць алеем, а пад кіраўніцтвам Мсціслава Дабужынскага пазнаёміўся з тэхнікай акварэлі. І хаця неўзабаве самааддана захапіўся супрэматычнымі канцэпцыямі Казіміра Малевіча, а пазней усё жыццё займаўся архітэктурай, тым не менш, маляваць пейзажы і нацюрморты любіў усё жыццё.

Хідэкель быў вучнем і сябрам К.Малевіча, адным з арганізатараў і ідэолагаў УНОВІСа, актыўным прапагандыстам супрэматызму, аўтарам шэрагу распрацовак супрэматычных ідэй у архітэктуры. У Віцебску ён займаўся выдавецкай дзейнасцю, пісаў артыкулы, удзельнічаў у творчых дыспутах... Яго цікавіла дзейнасць тэатральнай секцыі В.Ермалаевай, ён захапляўся паэзіяй Веліміра Хлебнікава і быў знаёмы з Уладзімірам Маякоўскім. Дыплом вольнага мастака і майстра-інструктара "з правам выкладання ў мастацкіх школах", атрыманы ў Віцебску, стаў хаця і значным, але ўсяго толькі першым этапам яго творчай біяграфіі. Пераехаўшы разам з К.Малевічам у Петраград у 1922 годзе, Хідэкель паступае вучыцца на архітэктурны факультэт Інстытута цывільных інжынераў, але працягвае падтрымліваць кантакты і з Малевічам, і ГІНХУКам. Праект Рабочага клуба, распрацаваны Хідэкелем у 1926 годзе, па сваёй сутнасці быў выразным сведчаннем развіцця ідэй супрэматызму ў архітэктуры.

На працягу многіх гадоў ён працаваў у якасці архітэктара, выкладаў... Моцная ўлюбёнасць у архітэктуру, як меркаваў сам Л. Хідэкель, была ў яго, хутчэй за ўсё, ад бацькі, даволі высокапрафесійнага будаўніка. Хаця, безумоўна, ў прафесійным станаўленні Хідэкеля значную ролю адыгралі Казімір Малевіч і Лазар Лісіцкі.

* * *

Жыццё Л. Хідэкеля не падобнае да трагічнага лёсу многіх яго сяброў і аднадумцаў па УНОВІСе. Мастак дажыў да 82 гадоў, памёр у 1986-м у Ленінградзе. Пры жыцці, як сведчаць даследчыкі, ён не меў персанальнай выставы. Прычыны гэтага невядомыя. Але мастацтвазнаўцы Ала Павіліхіна і Ларыса Жадава (ім яшчэ пры жыцці Л. Хідэкеля давялося пабачыць асноўную частку яго творчага набытку), прыгадвалі, як мастак шкадаваў, што не змог зберагчы ўсяго зробленага, дый зрабіў у свой час гэтак мала. Пра ўсё пабачанае Л.Жадава пазней напісала ў сваёй шырокавядомай кнізе "Пошук і эксперымент", выдадзенай на нямецкай мове ў ГДР.

Творы Лазара Хідэкеля, як і творы іншых унавісаўцаў, вельмі высока цэняцца на Захадзе. Да нядаўняга часу было вядома зусім няшмат яго кампазіцый, і кожная з іх каштавала сотні тысяч долараў. Але вось у канцы 90-х гадоў мінулага стагоддзя на рынку рускага авангарда раптам з'явілася даволі значная колькасць не вядомых раней твораў мастака. І разыграўся сапраўдны скандал... Прычына? Грошы, якія суправаджаюць цікавасць да творчасці мастакоў першай паловы XX стагоддзя. Іх творы зрабіліся вельмі добрым месцам укладання капіталаў. А таму ўзрастанне попыту на авангард не магло не выклікаць з'яўлення на рынку мастацтва вялікай колькасці падробак. І менавіта ў 90-я гады гэтая буйная антымастацкая акцыя дасягнула, бадай, свайго піку. Але пра ўсё па парадку.

Адна з найбуйнейшых калекцый твораў Хідэкеля была сабраная ў 80-я — пачатку 90-х гадоў французскімі калекцыянерамі Клодам і Рэнэ Булэ: больш як 170 твораў. Пасля шэрагу гучных скандалаў у сувязі з раскрыццём у замежных калекцыях фальшывых твораў мастакоў рускага авангарда, вядомыя ў свеце калекцыянеры Булэ звярнуліся да сына Лазара Хідэкеля — Марка з прашэннем пацвердзіць сапраўднасць твораў яго бацькі. Марк Хідэкель — таксама архітэктар і мастак — рабіў гэта неаднаразова, наведваючы Парыж і ў 1989-м, і ў 1991-м. Падчас свайго апошняга прыезду ён за 40 тысяч франкаў уласным подпісам заверыў 16 асабліва каштоўных бацькавых твораў. Асобнікі той калекцыі пазней экспанаваліся і ў музеі "Джоліет" у Канадзе (1991) і ў Шато-да-Танлей у Францыі (1993), і на Франкфурцкім кірмашы сучаснага мастацтва (1995).

Але знаёмства ў 1992 годзе Марка Хідэкеля з Інгрыд Хатон карэнным чынам змяніла роўны бег падзей. Новая знаёмая сям'і Хідэкеляў зацікавілася экспертнай ацэнкай тых твораў Лазара Хідэкеля, што знаходзіліся ў галерэі "Хатон", саўладальніцай якой з'яўлялася Інгрыд. Таму і адбылося некалькі сустрэч Хідэкеляў з І.Хатон у 1992—93 гадах у Нью-Йорку. А ў 1993-м Марк і Рэгіна Хідэкелі пераехалі ў ЗША на сталае месца жыхарства. І ўжо ў 1995 годзе ў галерэі "Хатон" Марк наладзіў выставу-продаж 70-ці як быццам бы прывезеных з Расіі і раней не вядомых твораў свайго бацькі. Аднак самым вялікім шокам для многіх сталася сцвярджэнне ў прадмове да каталога, што гэта "першая выстава сапраўдных твораў Лазара Хідэкеля". Тым самым пад сумніў былі пастаўлены творы, якія ў шэрагу ранейшых калекцый значыліся як арыгіналы Лазара Хідэкеля.

Версіі як мастацтвазнаўцаў, так і журналістаў, якія пісалі пра гэтыя падзеі, вылучаліся самыя розныя. За аднымі — усяго толькі ўласныя меркаванні аўтараў, за другімі — канкрэтныя факты і журналісцкія пошукі. Адкуль раптам узяліся 400 раней не вядомых твораў Лазара Хідэкеля? Як удалося вывезці столькі твораў сусветна вядомага майстра за мяжу? (Наконт легальнага вывазу твораў Хідэкеля ўвогуле не магла ісці размова, але і застацца незаўважаным на мытні з некалькімі сотнямі "нелегальных" твораў таксама было практычна немагчыма). І ці сапраўды творы Лазара Хідэкеля ў іншых прыватных калекцыях фальшывыя? Адказаць адназначна на пытанні, якія паўставалі адно за адным, было проста немажліва.

Адна з версій, выказаная ў газеце "Ленинградская правда", (07.09.2001), здаецца, падказала ключ да "вялікай таямніцы". Аўтар артыкула "Воскрешение Лазаря " В.Эскен сам сабе задаваў пытанне: ці не нарадзілася ўся гэтая спадчына Л.Хідэкеля... ужо ў ЗША, пасля эміграцыі туды сям'і яго сына? У якасці ўскоснага сведчання згадваліся падзеі сярэдзіны і канца 90-х гадоў. Так, у часопісе "Art News" у 1996 годзе Марк і Рэгіна Хідэкелі разам з Інгрыд Хатон абвясцілі, што ўся калекцыя Булэ складаецца з падробак, ды і пасведчанні, падпісаныя Маркам, — таксама фальшыўка. А сапраўдныя творы Хідэкеля, як зноў паўтарае І. Хатон, спасылаючыся на Марка і Рэгіну, знаходзяцца толькі ў яе галерэі. Булэ ў сваю чаргу падалі ў суд на Хідэкеляў і Хатон. І не дзіўна: 167 твораў Лазара Хідэкеля, кошт якіх перавышаў чатыры мільёны долараў, вокамгненна ператварыліся ў нішто.

Сёння сапраўднасць твораў Лазара Хідэкеля не можа гарантаваць ніхто. А таму калекцыянеры і музеі, якія валодаюць творамі гэтага мастака, у роспачы: дзе шукаць добрасумленных экспертаў-знаўцаў? Але для Віцебска і Беларусі гэта, здаецца, не актуальна: твораў Лазара Хідэкеля, як і арыгіналаў некаторых іншых мастакоў, што нарадзіліся на нашай зямлі і былі спакроўлены з ёю сваім талентам, тут проста няма.

Міхась ЦЫБУЛЬСКІ,
кандыдат мастацтвазнаўства
г. Віцебск

Фота забяспечана аўтарам

На здымках: Л. Хідэкель у 20-я гады; абстрактная кампазіцыя; сярод вучняў К. Малевіча на Віцебскім вакзале. 1920 г.

АПЫТАННЕ ГАЗЕТЫ "ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА"

Да нядаўняга часу пісьменнік (тут – "прафесійны літаратар") сплачваў свой доўг чалавецтву праз добрасумленнае выкананне абавязкаў "інжынера чалавечых душ". Сёння ў азначанай якасці ён грамадству відавочна... не тое што непатрэбны, але нецікавы.

Ніводны з літаратараў не мае шансу ўнікнуць таго асобаснага і адначасова прафесійнага выбару, якім, па сутнасці, і з'яўляецца сёння **славесная творчасць:** рухацца *следам* за жыццём ці *насустрач* (насуперак) яму? далучыцца да тых, хто складае эпосе гімнічныя песні, ці да тых, хто выштукоўвае для яе з'едлівыя эпітафіі?

Згаданы **выбар** урэчаўляецца ў літаратуры, што паўстае з сапраўднай жыццятворчасці. Тыя, для каго літаратура адбылася як жыццё, і тыя, для каго жыццё роўнае літаратуры, магчыма, блукаюць у трох соснах, а ўсё ж не дагукаюцца адзін аднаго.

Дык **дзе** мы ёсць і **чым** мы ёсць, шаноўныя "літчалавекі"?

Бадай, толькі пасля шчырых адказаў на гэтыя пытанні можа адкрыцца, ці БУДЗЕМ мы...

Аддзел крытыкі "ЛіМа" з нецярплівасцю чакае вашых, шаноўнае спадарства, роздумаў-водгукаў, якія можна дасылаць у рэдакцыю, па адрасе: 220005, г. Мінск, вул. Захарава, 19; e-mail: minsk@lim.by

А мне сорамна...

Валянціна КАДЗЕТАВА

Калі я думаю пра становішча, у якім апынулася сёння родная літаратура і беларускія пісьменнікі, то ніяк не магу пазбавіцца адчування няёмкасці і сораму. МНЕ СОРАМНА ЗА НАШУ КРАІНУ, якая адрынула, бы непатрэбшчыну, і прыгожае пісьменства, і пісьменнікаў, і культуру ўвогуле.

Тое ж прыкрае "сорамна", няхай сабе ў рознай ступені прыхаванае, бачыцца мне ў большасці водгукаў на "ЛіМ"-апытанне: у скрозь песімістычных ("не друкуюць", "не чытаюць", "не заўважаюць"), у штучна бадзёрых з няпэўнымі заклікамі-спадзяваннямі ("збяромся", "выберамся", "перажывём", "дачакаемся"), і нават у крыху дэманстратыўных ("трэба радавацца, што маем свабоду"), бо свабода і адрынутасць — паняцці, пагадзіцеся, далёка не раўназначныя.

Адвечна творцы былі носьбітамі духоўнай культуры, і нялёгкая праца іх неяк цанілася. Прынамсі, у тыя часы, калі, па словах беларускага класіка, "у пашане былі пісьменнікі, а не злодзеі".

Сёння ж пісьменнікі, даведзеныя да жабрацкага стану, перш за ўсё мусяць думаць пра тое, як зарабіць на кавалак хлеба, а потым ужо займацца лёсам, ім прызначанай (ці то як пакаранне, ці то як узнагарода?) справаю-творчасцю.

А шматгадовае чаканне выхаду кнігі? А ганарары, выдадзеныя "натураю"? Вопыт, праўда, не новы, але заслугоўвае пэўнай увагі. Чаму б не пераняць яго, напрыклад, прадпрыемствам, што вырабляюць... чыгуначныя рэйкі? Вырабіў працаўнік нейкую колькасць рэек — на плечы іх і — уперад. Рэалізуй сабе на здароўе!

Дык то ж рэйкі... Без іх нельга. А без кнігі — можна?!

Але тое, што пісьменнікі сталі непатрэбныя некаторым з чыноўнікаў, зусім не азначае, што яны не цікавыя грамадству. Даводзілася мне прысутнічаць на сустрэчах Уладзіміра Саламахі, Васіля Ткачова, Анатоля Зэкава са студэнтамі, школьнікамі і звычайнымі вясковымі працаўнікамі. Трэба было паглядзець, з якім захапленнем іх слухалі! І пытанні былі, і наіўныя прызнанні: "А мы і не ведалі, што вы такі цікавы чалавек і пісьменнік! А дзе вашы кніжкі прачытаць можна?.." Не ведалі... Так адкуль жа ім ведаць, калі кнігі не выдаюцца, перыядычных літаратурна-мастацкіх выданняў у бібліятэках вельмі мала, ды яны амаль не прапагандуюцца.

Мне могуць запярэчыць: а школы? А настаўнікі літаратуры? Ці ж не найперш іх клопат — абуджаць цікавасць да прыгожага пісьменства?

Таццяна Шамякіна ў артыкуле "Калі Логас становіцца тэкстам..." ("ЛіМ", 11 студзеня, 2005 г.) піша: "Базавая школа як грамадскі інстытут, дзякуючы якому можна выхаваць любоў да чытання, навучыць адчуваць прыгажосць слова, не выконвае сваіх функцый". Дадаю: і не будзе выконваць, пакуль радыкальна не зменіцца змест праграм і мова падручнікаў, што не толькі не дапамагаюць выхоўваць любоў да чытання, але і адпрэчваюць ад яго ўвогуле. Настаўнікі ж не маюць права "ні на ёту" адступіць ад праграмы, бо за імі пільна сочыць нядрэмнае вока правяраючага, які не лічыць за сорам корпацца нават у рабочых планах настаўніка. А настаўнікі нашы ў такой меры, даруйце, "затурканыя", што зрэшты згубілі і годнасць сваю, і смеласць. Ды зняверыліся яны, бо колькі ўжо часу гавораць і пішуць пра тыя ж праграмы ды падручнікі, а ўсё застаецца па-ранейшаму. Горш за тое: нядаўна з'явілася новая пагроза для духоўна-гуманітарнага развіцця асобы — ТЭСЦІРАВАННЕ. Назіраю ажыятаж, узняты вакол яго "прынятага ва ўсім цывілізаваным свеце", і ўспамінаецца мне... абломаўскі служка Захар, які падаваў свайму пану шклянку вады, прыкладаючы намаганні, дастатковыя для таго, каб адчыніць вароты. Можа, для дакладных навук тэсціраванне — дабро, для гуманітарных жа дысцыплін, асабліва для мовы і літаратуры — згуба.

Я люблю беларускую літаратуру і лічу: цаніць і паважаць яе, сённяшнюю, трэба ўжо нават за тое, што стваральнікі яе, за выключэннем адзінак, не паддаліся спакусе таннай папулярнасці, не кінуліся ў смакаванне і ўслаўленне жывёльных інстынктаў, не зрабілі героямі (у прамым сэнсе гэтага слова) кілераў, путан і г.д. Здаецца, і "адзінкі" ўжо схамянуліся, бо заўважылі: нават тыя чытачы, што з асалодаю спажывалі бруднае пойла пахабшчыны, апошнім часам не вельмі квапяцца на яго — наталіліся — і вось-вось наступіць час, калі ім захочацца крынічнай вадзіцы: попыт на чысціню не знікаў ніколі.

Адзін малады, але даволі эрудзіраваны, цікавы смеласцю і арыгінальнасцю меркаванняў, а галоўнае — шчырасцю, што не так часта цяпер бывае — у сваім водгуку на "ЛіМ"-апытанне выказаў шмат слушных думак. Але дазволю сабе заўважыць, што многае з негатыву, пералічанага аўтарам (прозвішча называць не буду, бо ўсё ж крыху хвалю яго, а ён гэтага не любіць) — выдаткі рынкавай эканомікі, на міласць якой, нароўні з вытворчымі сферамі, кінута наша літаратура. Гэта і "бедны літаратар, які шукае паратунку ад вар'яцкага свету ў бутэльцы", і "пісьменнікі, не здольныя знайсці кампраміс у айчынным літаратурным і светапоглядным настроі", ды і многае іншае. Што ж да пасрэдных кніг, "няспынную плынь якіх нельга спыніць", то мне здаецца — можна. Прынамсі, тых, што выходзяць у прыватных выдавецтвах на сродкі аўтараў, якія "антирисуются стихами" (І. Бунін) і здольныя заплаціць любыя грошы, каб стаць "пісьменнікамі". Справа ў тым, што большасць пасрэдных, а то і ўвогуле "ніякіх" кніг выходзіць у свет менавіта такім чынам. Гэта не азначае, што дзяржаўныя выдавецтвы выпускаюць скрозь высокамастацкія творы. Надараюцца і тут "чорныя бровы сівой каровы", якія да таго ж чамусьці "на дровах", але ўсё ж асноўная частка "няспыннай плыні" нараджаецца якраз у прыватных выдавецтвах.

На папрокі ў несучаснасці хочацца адказаць, што, па-першае, ёсць, былі і будуць агульначалавечыя тэмы, якія ніколі не страчваюць сваёй актуальнасці, па-другое, "лицом к лицу лица не увидать" — патрэбен час, іншым разам немалы, каб пераасэнсаваць убачанае, перажытае і ўвасобіць яго ў творы, сапраўдным творы, а не моднай "аднадзёнцы", якую змайстраваў які-небудзь новаспечаны "геній" у час стаяння на галаве.

У нейкай ступені здзівіла мяне пытанне лімаўскай анкеты адносна выбару "рухацца за жыццём ці насустрач (насуперак) яму". Хіба можа творца свядома зрабіць такі выбар? Мне здаецца, што гэта ўсё роўна як бы загадаць сабе: а давай-ка я пакахаю (узненавіджу) вунь таго чалавека! У творчасці, як і ў каханні (нянавісці), мы сабе непадуладныя. Галоўнае — слухаць голас свайго сэрца. Не падладжвацца. Не крывадушнічаць. Быць самім сабою.

І яшчэ думаецца мне: не варта чакаць, быццам нешта ў адносінах да літаратуры і пісьменнікаў з боку дзяржавы зменіцца, так бы мовіць, стыхійна. Можа, нейкім чынам (дальбог, не ведаю якім) паспрабаваць давесці некаторым чыноўнікам, што ніякія матэрыяльныя даброты, ніякая медыцына, ніякія спартыўныя дасягненні не ўратуюць наш люд ад немачы бездухоўнасці, якая "з'ядае" ў чалавеку тое, што ўласна і робіць яго чалавекам. У рэшце рэшт, павінны ж яны зразумець, што будучае краіны, дзе не ў пашане літаратура і культура, НЕЗАЙЗДРОСНАЕ...

За бортам

Сяргей ПАТАРАНСКІ

Сітуацыя ў СМІ з папулярнасцю літаратуры і нацыянальнай культуры — "весялей не бывае". Прафанацыя, на маю думку, сёння дасягнула найвышэйшай кропкі. Але мы самі, "літчалавекі", хіба лепшыя?

Складваецца ўражанне, што "тытаны розуму" і "пастыры Духу Беларускага" замест належнай творчай працы займаюцца актыўнай міжусобнай барацьбой, з абавязковым абліваннем брудам апанента. Зразумела, гэта зусім не спрыяе здаровым мастацкім працэсам, а пакідае большасць творцаў "за бортам" самой культуры. Паспрабуй тут пасля "б ы ц ь"!

За выступленнямі з сур'ёзных трыбун, здаецца, забылі пра галоўнае, — дзеля чаго гэта рабілася! І да справы, як правіла, рукі не даходзяць...

Пра якую прапаганду нацыянальнай гісторыі і каштоўнасцей, дый, увогуле, добрага, светлага і вечнага казаць табе, "літчалавек", калі глядзіш на свайго калегу па пяры, як Іуда на Хрыста? Які ж мы прыклад паказваем сваёй нацыі, калі самі хоць бы крыху не набліжаемся да тых ідэалаў і вобразаў, якія ствараем?

Што ўжо тады гаварыць пра моладзь, якая захапляецца "чорнымі бумерамі" і таму падобным, дый амаль нічога не ведае пра сваю вялікую культуру і гісторыю?.. Думаю, што кожны павінен пачынаць з сябе, і ў першую чаргу гэта павінны разумець самі творцы.

Як часта нам даводзілася чуць, што клоуны — гэта артысты, якія іграюць у цырку ролю чалавека. А арэну адначасова называюць крыніцай юнацтва, якая захоўвае клоунам вечную маладосць. Сапраўды, калі трапляеш у цырк, заўважаеш, што гэта месца, дзе час спыніўся, паколькі тут кожны чалавек зноў і зноў вяртаецца ў дзяцінства. А кожны клоун здаецца нам падобным на смешнага, размаляванага блазна.

Аднак, калі прыглядзецца ўважліва, можна заўважыць, што кожны артыст і выглядае, і ўздзейнічае на публіку па-свойму. Цікава, што з даўніх часоў была традыцыя: пасля вучобы малады цыркач прымаў імя настаўніка. Менавіта ў гэтым факце заключана адна з прычын незвычайнай устойлівасці некаторых цыркавых дынастый, прозвішчы якіх аднолькава насілі як прамыя нашчадкі, так і вучні. І наш герой — не выключэнне.

Уладзімір Камардзін:

«Клоун павінен быць добрым»

Заслужаны артыст Расіі Уладзімір Камардзін працуе клоунам з самога юнацтва. І нягледзячы на разнастайныя напрамкі ў жанры клаунады — буфанадныя, парадыйныя, музычныя, пантамімныя, — ён аддае перавагу жанру пародыі. Яму падабаецца працаваць з рэпрызамі, у кожнай з якіх выкарыстоўвае разнастайныя трукі і фокусы. Гэта пераважна і складае рэпертуар Камардзіна.

... А пачыналася ўсё з захаплення ўзвядзеннем стацыянарнага будынка цырка, які знаходзіўся насупраць дома будучага вядомага клоуна. Маленькі Уладзімір пільна сачыў за працэсам будоўлі. І праз пэўны час, калі адбылося прадстаўленне першай праграмы, ён наведаў цырк. "Я з неверагодным задавальненнем глядзеў на выступленне клоунаў. Мяне гэта настолькі ўразіла, што пасля заканчэння праграмы вырашыў: стану клоунам", — успамінае Уладзімір Камардзін. Пасля школы ён адразу паступіў у Маскоўскае цыркавое вучылішча.

З таго часу мінула шмат гадоў. Але першы выхад на арэну артыст памятае і па сённяшні дзень, нібыта гэта было ўчора. "Мой дэбют адбыўся ў Адэсе, — расказвае Уладзімір Камардзін. — Зала была перапоўнена гледачамі, але я так хваляваўся, што нікога не бачыў. Самае галоўнае для мяне тады было — не забыцца пра паслядоўнасць дзеянняў у выкананні нумара. Калі прыйшоў за кулісы, увесь аказаўся мокры ад поту, нібыта здаваў нарматыў па фізічным выхаванні (усміхаецца). Потым паступова прывык, прасцей пачаў ставіцца да публікі, адчуваць яе".

Аднак, пачуццё хвалявання перад выхадам на манеж не пакідае яго і зараз. "Асабліва гэта праяўляецца падчас выканання новых элементаў у рэпрызе. Я пачынаю думаць, атрымаецца зрабіць трук ці не, — прызнаецца клоун. — Але хвалююся толькі за кулісамі. Калі перакрочваю мяжу арэны, хваляванне адступае і пачынаецца праца".

Менавіта ў гэты час для артыста вельмі важная рэакцыя публікі. "Надзвычай прыемна, калі гледачы настроены на адпачынак. Яны і прыхінаюць да сябе артыстаў. Складана працаваць для аўдыторыі, якая халодна рэагуе на выкананне трукаў і фокусаў, — працягвае Уладзімір Камардзін. — Таму не люблю працаваць на шэфскіх прадстаўленнях, калі гледачы прыходзяць бясплатна. Такую публіку немагчыма нічым здзівіць. Яна горш успрымае цыркавыя нумары, чым тая, якая набывае білет за уласныя грошы."

А гульнавядома, што ў клаунадзе самае складанае заваладаць публікай, сканцэнтраваць яе ўвагу на сабе. Справа ў тым, што падчас выступлення клоуна, як правіла, на манежы пачынаецца перастаноўка, ідзе падрыхтоўка да наступнага нумара. А задача клоуна заключаецца ў тым, каб "адцягнуць" гледача ад таго, што адбываецца на арэне і адначасова данесці сутнасць жарту, рэпрызы да публікі. "Я лічу, што жарт павінен быць добрым, таму ніколі не прытрымліваюся злога гумару. Стараюся жартаваць тонка, мягка, — тлумачыць Уладзімір Камардзін. — Галоўнае — не адразу выклікаць у публікі смех, а зрабіць так, каб яна глядзела нумар з захапленнем, і з усмешкай на вуснах, і з сумам. Клоун павінен быць добрым. Злога клоуна не ўспрымае публіка. Напрыклад, калі на манежы працуюць два артыста, адзін добры, другі злы, злодзея, як правіла, ніхто не хоча іграць. Мой партнёр часта кажа: "Слухай, ты такі няшчасны, людзі цябе шкадуюць, а я выходжу і адбіраю ў цябе кветкі і цукеркі. Мне сапраўды становіцца вельмі сорамна".

Уладзімір Камардзін перакананы ў тым, што цырк — гэта відовішча. Яго трэба глядзець, а не слухаць. Калі пачынае гучаць музыка і клоун нешта гаворыць, яго пачуюць гледачы толькі з першых радоў. І ў выніку атрымліваецца, што трэці рад смяецца, дзесяты маўчыць. А дзейнасць клоуна накіравана на працу з усёй залай. Каб было смешна кожнаму ў асобнасці і ўсім адразу, неабходна пачуццё пастаяннага натхнення. Яго мой герой чэрпае ў... магазіне дзіцячых цацак. "Бывае, стаю каля вітрыны, гляджу на прыгожых зайчыкаў, малп, мядзведзяў і спрабую ў думках імправізаваць з імі, каб потым вынесці нейкую задуму на манеж. Так часта нараджаюцца цікавыя рэпрызы", — заўважае Уладзімір Камардзін. Сапраўды, не толькі парадыйныя нумары клоуна, але і яго аблічча вяртае гледача ў далёкае дзяцінства, светлае, цёплае, прыгожае. Невыпадкова, што на маё пытанне: "Якая казка вам найбольш падабалася ў маленстве?", артыст адразу адказаў: "Чыпаліна". "Жоўты колер асацыіруецца ў мяне з куранятамі, сонцам, пяском, цеплынёй. Нават касцюм для выступлення жоўтага колеру чамусьці нагадвае цыбулю з цікавым імём Чыпаліна", — заўважае клоун.

Падчас размовы з Уладзімірам Камардзіным, я яшчэ раз пераканалася ў тым, што клоуны — вельмі сумныя людзі па жыцці. "Сапраўды, я не надта люблю вялікія кампаніі, — прызнаецца артыст. — Мне больш даспадобы заставацца адному". Аднак нягледзячы на такую рысу характару, лёс надзяліў яго цікавымі сустрэчамі і знаёмствамі, сярод якіх такія вядомыя клоуны, як Нікулін і Карандаш. Паводле слоў Уладзіміра Камардзіна, менавіта Нікулін у свой час дапамог яму набыць... кватэру. Многія памятаюць, як на пачатку 90-х гадоў на тэрыторыі Расіі ствараліся разнастайныя арганізацыі, так званыя піраміды кшталту "МММ", куды людзі ўкладвалі грошы. Потым кампанія разбуралася, і не заставалася нічога, у тым ліку, і грошай. Менавіта ў такой сітуацыі апынуўся і наш герой. Адной з маскоўскіх арганізацый ён заплаціў васемнаццаць тысяч долараў — трыццаць працэнтаў ад кошту кватэры (якія павінны былі "пагасіцца" на працягу дзесяці гадоў) з надзеяй, што праз год атрымае ключы ад уласнага жылля. Як было дамоўлена, праз пэўны час Уладзімір Камардзін звярнуўся да працаўнікоў арганізацыі, каб набыць кватэру. Адказ быў лаканічным: "Людзі стаяць у чарзе ўжо два — тры гады. А вы чагосьці хочаце праз год". Стала зразумелым: грошы вяртаць марна. Артысту нічога не заставалася, як звярнуцца па дапамогу да Нікуліна. "Юрый Уладзіміравіч папрасіў у мяне кантактныя тэлефоны арганізацыі і даволі хутка расставіў усе кропкі над "і". У выніку мне прапанавалі такі варыянт: выбраць адну з трох кватэр у розных раёнах Масквы. Я выбраў тое, што мне бліжэй, — успамінае Уладзімір Камардзін. — Нікулін быў вельмі добрым чалавекам. Ён шмат дапамагаў артыстам, калі тыя звярталіся да яго. Сёння я вельмі ўдзячны яму. Каб не гэты чалавек, з жахам думаю, дзе б я жыў, што б са мной магло адбыцца".

У гэтай жахлівай сітуацыі толькі цырк дапамог нашаму герою вярнуцца да жыцця. "Манеж заўсёды дабаўляў мне сіл. І сёння, калі апынаюся на арэне, адчуваю сябе юнаком. Адразу праходзіць стомленасць і слабасць, — заўважае артыст. — Нават у адпачынку праз пэўны час пачынаю сумаваць па манежы. Мяркую, добрая звычка бясконцай працы дае аб сабе напамін".

Марына ЦЯРЭШЧАНКА

Фота забяспечана аўтарам

"ЛіМ" працягвае друкаваць успаміны былога дырэктара Беларускай дзяржаўнай філармоніі Георгія Загародняга — эпізоды з жыцця канцэртнай установы савецкіх часоў.

Закулісныя сюжэты

Волжскі інцыдэнт

Творчы шлях легендарных "Песняроў" быў не такі ўжо лёгкі і бесклапотны, як камусьці можа здацца. Кіраўніку ансамбля Уладзіміру Мулявіну часцяком даводзілася абараняць свае творчыя прынцыпы, настойліва даказваць правамернасць выканання на эстрадзе беларускіх народных песень у сучаснай апрацоўцы. Але ўсё гэта не ішло ні ў якое параўнанне з тым, што давялося зведаць маладому самабытнаму калектыву і яго кіраўніку восенню 1971 года падчас гастроляў у Валгаградскай вобласці. Заведама справакаваны непрыгожы інцыдэнт зняславіў тады беларускіх артыстаў на ўсю краіну.

...Пасля паспяховага выступлення на песенным фестывалі ў Сопаце ансамбль "Песняры" адразу накіраваўся на гастролі па Волзе. Яны пачаліся канцэртам у горадзе Волжскім, непадалёк ад Валгаграда. Кіраўніцтва абласной тэлестудыі паставіла сабе за мэту зрабіць відэазапіс канцэртнай праграмы папулярнага ансамбля непасрэдна з залы Волжскага палаца культуры. Даведаўшыся пра гэта, Мулявін сходу адхіліў задуму мясцовага тэлебачання. Бо памяшканне палаца зусім не падыходзіла для такіх відэазапісаў, і дамагчыся высокай якасці гучання песенных нумароў было б немажліва. І тым не менш, тэлевізійнікі настойвалі на сваім. "Добра, — нарэшце згадзіўся кіраўнік "Песняроў", — дазваляю запіс, але аднаго першага аддзялення".

Аднак і пасля антракту тэлеаператары па-ранейшаму заставаліся на сваіх працоўных месцах, хоць бы што працягваючы распачатыя здымкі. І тут абураны такім нахабствам Мулявін перарваў канцэрт і запатрабаваў спыніць відэазапіс. Толькі пасля гэтага тэлекамеры былі адключаны, і выступленне беларускіх выканаўцаў аднавілася.

Што датычыць самога інцыдэнту, дык ён меў негатыўныя вынікі. Праз нейкі час у рэдакцыю "Комсомольской правды" паступіла некалькі лістоў з Валгаграда, у якіх гастролі беларускага ансамбля былі раскрытыкаваны. Хаця, між іншым, дзе б ён тады ні выступаў, у тым ліку і ў Волжскім, ніякіх прэтэнзій з боку гледачоў не ўзнікала. А тут раптам у адным лісце "Песняроў" без усялякага абгрунтавання абзывалі "групай дзялкоў", якія нібыта ўчынілі "скандал перад мікрафонамі" з-за нежадання "бясплатна запісвацца" на тэлебачанні.

Думаю, да з'яўлення падазроных пісьмаў, хутчэй за ўсё, мелі дачыненне тыя кіраўнікі Валгаградскай тэлестудыі, якія не маглі дараваць Мулявіну яго бескампрамісны характар. А "Комсомолка", не праверыўшы праўдзівасць выкладзеных у пісьмах фактаў, падрыхтавала паводле іх крытычную публікацыю. Афіцыйныя ўлады, не разабраўшыся ў сутнасці канфлікту, паспяшаліся з рэагаваннем на крытыку ў саюзным друку.

І неўзабаве ў Беларускую дзяржаўную філармонію прыйшоў загад з Міністэрства культуры СССР за подпісам тагачаснага міністра Кацярыны Фурцавай, у якім "Песнярам" часова забаранялася займацца гастрольнай дзейнасцю на ўсёй савецкай прасторы. Для Уладзіміра Мулявіна і яго сяброў-музыкантаў гэта было раўназначна адхіленню ад улюбёнай працы.

Каля года, пакуль не адмянілі тую забарону на гастролі, працягваўся для "Песняроў" непрадугледжаны рэпетыцыйны перыяд. За гэты час незвычайна працавіты і здольны ад прыроды Мулявін падрыхтаваў з ансамблем шмат новых песень для наступных музычных конкурсаў. Толькі ў 1973 годзе "Песняроў" тройчы ганаравалі лаўрэацкімі званнямі. Як бы падводзячы вынікі чатырохгадовай працы беларускага ансамбля на эстрадзе, тая ж "Комсомольская правда" апублікавала хвалебны артыкул. Але наўрад ці была патрэба ў такой рэабілітацыі "Песняроў" — тады ўжо ўсенародна прызнаных і папулярных.

Нам было не да жартаў

У 70-я гады мінулага стагоддзя на абсягах колішняга СССР часта праводзіліся святы нацыянальных культур саюзных рэспублік. Беларусь гасцінна прымала ў сябе ўдзельнікаў дзён, дэкад літаратуры і мастацтва Літоўскай, Украінскай ССР, Расійскай Федэрацыі. Нашы майстры культуры выязджалі з візітамі ў адказ.

Асабліва незабыўныя ўражанні выклікаў у мяне фестываль беларускай культуры, праведзены ў Алтайскім краі РСФСР. Памятаю, як у пачатку чэрвеня 1973 года ад чыгуначнага вакзала беларускай сталіцы адышоў хуткі цягнік "Мінск — Барнаул", у якім размясціліся лепшыя нашы мастацкія калектывы і салісты: Дзяржаўны народны хор, народны аркестр, Ансамбль танца, славутыя "Песняры", Віктар Вуячыч з інструментальнай групай, іншыя вядучыя эстрадныя выканаўцы.

Пасля ўрачыстага адкрыцця фестывалю, якое адбылося ў Барнаульскім палацы спорту, усе выканальніцкія калектывы і ансамблі раз'ехаліся па загадзя вызначаных маршрутах для канцэртных выступленняў у буйных гарадах і раёнах Алтайскага краю. У той жа час у работнікаў адміністрацыйна-пастановачнай часткі надарылася некалькі вольных дзён, і ў крайвыканкаме параілі выкарыстаць іх для азнаямлення з памятнымі мясцінамі Горнага Алтая.

Падабралася група з чатырох чалавек, у якую ўвайшлі, апрача мяне і майго намесніка Б. Гершовіча, галоўны рэжысёр нашай філармоніі Ю. Ужанцаў і намеснік начальніка Упраўлення па справах мастацтваў У. Гуртатоўскі. Бліжэйшым авіярэйсам мы хутка дабраліся з Барнаула да Горна-Алтайска — цэнтра аўтаномнай вобласці. Гаспадары азнаёмілі нас з экспазіцыяй краязнаўчага музея, паказалі лясны гадавальнік, дзе разводзяць высакародных аленяў (маралаў). А наперадзе чакаў яшчэ адзін сюрпрыз: знаёмства з блакітным цудам Горнага Алтая — Цялецкім возерам (Алтын Кёлем, якое ў перакладзе з алтайскай мовы завецца Залатым). Ахутанае рознымі таямніцамі і легендамі, гэтае возера, што па глыбіні (325 м) саступае толькі Байкалу, прыцягвае ўвагу шматлікіх турыстаў і аматараў далёкіх падарожжаў. Хаця трапіць туды можна з дапамогай адно толькі малой авіяцыі.

Калі мы ляцелі на двухкрылым самалёце, праз ілюмінатар добра была відаць прасторная роўнядзь вады ў скалістых абрывістых берагах, пакрытых зялёным кілімам тайгі. За кожным мысам гэтай нерухомай азёрнай стужкі працягласцю 77 км перад нашымі вачамі адкрываліся цудоўныя краявіды на фоне снежных шапак Алтайскіх гор.

Самалёт прызямліўся; дырэктар мясцовай турбазы сустрэў нас ля трапа. У наша распараджэнне вылучылі катэр, на якім мы правялі шматгадзінную прагулку па Цялецкім возеры. Потым перабраліся на процілеглы бераг, дзе мясцовыя жыхары — работнікі Алтайскага запаведніка наладзілі ў гонар нашага прыезду сяброўскую вячэру. Вярталіся на турбазу ўжо глыбокай ноччу на веславой звычайнай лодцы без сігнальных агнёў. Цемра згусцілася непраглядная. І пакуль дасягнулі другога берага, нямала набраліся страху, баючыся, каб не сутыкнуцца з якой-небудзь выпадковай "маторкай". На шчасце, усё абышлося без прыгод.

А вось на досвітку наступнага дня нечакана сапсаванае надвор'е збянтэжыла кожнага з нас, парушыла агульны душэўны стан. Густая непранікальная заслона туману агарнула возера і крутыя схілы гор. Пры такіх умовах не варта было чакаць прыбыцця самалёта на турбазу. "Што будзем рабіць? — хваляваўся рэжысёр Юрый Ужанцаў. — У мяне ж на вечар прызначана рэпетыцыя заключнага канцэрта". "Давядзецца пакуль тут пазагараць", — пажартаваў Уладзімір Гуртатоўскі. Але, шчыра кажучы, нам было не да жартаў, бо баяліся спазніцца на закрыццё фестывалю. "Нічога, сябры, не перажывайце. Паводле маіх шматгадовых прагнозаў, да абеду надвор'е павінна наладзіцца, і самалёт за вамі абавязкова прыляціць", — супакоіў дырэктар турбазы.

І сапраўды, туман паступова пачаў рассейвацца, і над стромкімі скаламі заблішчэлі сонечныя промні. Хутка прыляцеў самалёт, які даставіў фестывальную групу ў Горна-Алтайск. А там ужо бліжэйшым рэйсам дабраліся мы і да Барнаула, дзе праз дзень вялікім канцэртам закончылася свята беларускай культуры.

Георгій ЗАГАРОДНІ

Фота забяспечана аўтарам

Палыновы вецер

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 9)

Няма ўжо Саюза. А дзе ж савецкія людзі? І ён, Косця Варонін, быў савецкім чалавекам, перадавіком, пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва. А цяпер ён браканьер і забойца. Забойца лася, забойца чалавека. Былога франтавіка, фінагента, загадчыка фермы, старшыні сельсавета, дэпутата. Паважанага ў вёсцы чалавека. Але ж ён падмануў Косцю, не стрымаў слова. Выціскаў з людзей сокі, спаганяў нядоімкі, падаткі. А хіба іншы не спаганяў бы? Тое самае. А можа, з яшчэ большай лютасцю. У вайну ацалеў. Паранены быў. А я застрэліў яго, як сабаку. Хто мне даў на гэта права? Ніхто. Я помсціў за крыўду...

Але чым болей разважаў Косця, тым крыўда ягоная неяк менела, нібы ўсыхала, раставала, быццам Поўня высвеціла яе па-новаму.

Тым часам ён дацягнуўся да стажка сена, зайшоў з тарцовага боку, ад Бесядзі, найбольш асветленага поўняй. Выскуб зляжалага сена, адчуў пах чабору ці то рамонкаў, зняў з пляча стрэльбу, прымасціў яе з правага боку, нібы асцерагаўся нейкага нападу, ці збіраўся паляваць на зайцоў, якія часцяком прыбягаюць да стагоў сена. Сеў, выцягнуў стомленыя ногі, заплюшчыў вочы. Прыслухаўся — нідзе ні гуку. Быццам усё ў прыродзе здранцвела пад мёртва-жоўтым месяцовым святлом. Але раптам вуха ўлавіла далёкі сабачы брэх — мусіць, у Хатынічах якатаў малы сабачка. Ад Бесядзі пачуліся іншыя гукі, нейкі прыглушаны шум. Дакладна Косця не мог вызначыць: ці шуміць дзесьці на перакаце вада, ці шуміць у ягоных вушах, бо адчуваў, што патыліца нібы налілася свінцом. Адчуў, што галава пачынае кружыцца, здавалася, ён падымецца і адразу ўпадзе. Паварушыўся, пакруціў галавой, сена зашамацела, у нос патыхнула водарам лугавых зёлак. А яшчэ падалося, што сена дыхае летняю цеплынёю.

Як хораша пахне сена, падумаў Косця, мусіць, мая апошняя прыемнасць. Але ж і ў гэтым духмяным сене — смяртэльныя нукліды...

Цяпер, седзячы ў стажку, пазіраючы на вялізную Поўню, ранейшыя трывогі і клопаты падаліся Косцю дробязнымі, нікчэмнымі. Ён толькі што пазбавіў жыцця чалавека. Паважанага, заслужанага, былога франтавіка. І цяпер ён, Косця, павінен вырашыць і свой лёс. У адным ён усё мацней пераконваўся: жыць яму не хочацца. У думках падзівіўся жывучасці бацькі, які ў далёкай Аргенціне зноў пусціў карані, звіў сваё гняздо, мае жонку, дзяцей і ўнукаў. А ў Косці ёсць толькі прага напіцца, каб забыцца пра ўсё на свеце. Зрэшты, у яго застаўся адзіны клопат: як пазбавіць сябе жыцця. Адказ і на гэтае пытанне ёсць: пад рукою двухсталовка, у якой прытаіліся дзве кулі з тупымі дзюбамі. Яны чакаюць свайго часу.

Раптам Косця пачуў дзіўныя гукі з лесу. Нейкі прыглушаны кліч: угу-ух! угу-гу-гух! Праз нейкі час яму нехта адгукнуўся: угу-ух! Косцю зрабілася вусцішна, адчуў, што аж валасы заварушыліся пад шапкаю. "Няўжо гэта мяне кліча нехта? — у Косці заледзянела ўсё ўнутры ад гэтай думкі.— Можа, душа Сырадоева кліча? Значыць, пара. Трэба сцягнуць правы бот. Пацалаваць рулю стрэльбы..." Косця яшчэ прыслухаўся, і да яго дайшло, што гэта перагукваюцца сычы дзесьці за Бабінай гарою. Але цяплей на душы ад гэтай здагадкі не зрабілася. Холад нібы ледзянымі абручамі сціскаў яго цела. Косця падняўся, ускінуў на плячо стрэльбу і пачаў тупаць вакол стога. Зрабіўшы круг, спыняўся, пазіраў на Поўню.

Ён углядаўся ў неба, як ніколі ў жыцці, бо разумеў: гэтая ноч апошняя. І думаў ён пра гэта спакойна, як пра даўно вырашаную справу, даўно зроблены выбар. Зоркі праглядваліся слаба — поўня забівала іх сваім святлом. Якое вялікае неба, высокае, бязмежнае. Яно дае дождж і снег, улетку на ім часам успыхвае казачна прыгожая вясёлка — Косця ў маленстве любіў пазіраць на вясёлку над Бесяддзю. А што чалавек дае небу? Дым, копаць, смурод. Вось і ён, Косця Варонін, паўсотні гадоў капціў неба. Але ўсё мае свой пачатак і свой канец. Жыццё, каханне, любая справа... Ну што, трэба сцягваць правы бот...

Але зрабіць гэта ён яшчэ не быў гатовы. Згадаў, як мінулаю ноччу цалаваўся з Аксеняй. Падалося, што было гэта даўным-даўно. Тады ён і не думаў, што цалуе жонку апошні раз. Пэўна, і яна пра гэта думаць не магла. Бедная Аксеня, застанешся ты адна, затое вольная. Можа, яшчэ знойдзеш каго і будзеш дажываць свой век. Ёсць у цябе брат, высокі начальнік, мне адмовіўся памагчы, але родную сястру не пакіне без увагі.

Косця тэпаў круга стажка, як у зачараваным коле...

Знайшлі труп Косці Вароніна праз два дні, надвячоркам. Адшукала міліцыя са службовымі сабакамі.

* * *

Івана Сырадоева праводзілі ў апошні шлях сотні людзей — сышліся з усіх вёсак сельсавета. Старшакласнікі мясцовай школы неслі вянкі, на чырвоных падушачках баявыя ўзнагароды. Дзень быў хмарны, падалі рэдкія бухматыя сняжынкі, яны траплялі на васкова-бледны твар нябожчыка і не раставалі.

Над магілаю Косці Вароніна галасілі тры жанчыны: маці, сястра і жонка.

На другі дзень пасля пахавання ўдава Аксеня атрымала ліст з рэдакцыі абласной газеты. У ім паведамлялася, што копію Косцевага ліста адаслалі ў пракуратуру раёна з просьбай пераглядзець справу, вызначыць віну кожнага ўдзельніка палявання і адпаведна размеркаваць суму штрафа. У той жа дзень Ніна, Косцева сястра, атрымала паштовы перавод на сто долараў, яе запрашалі ў раённае аддзяленне ашчаднага банка. Ніна Сцяпанаўна ўглядалася ў бледна-жоўты квадрацік казённай паперы, і гарачыя слёзы каціліся з ейных вачэй. Сэрца разрывалася ад жалю: чаму гэты перавод не прыйшоў на тыдзень раней?!

Віктар СТРЫЖАК

Маналог вежынца

Паэма-споведзь

Мінула дзесяць гадоў, як не стала харошага паэта і цікавага чалавека Віктара Стрыжака. Ён не быў палітызаваным творцам, проста шчырым беларусам. Але пра лёс Якава Рыгоравіча Падуты не мог не напісаць. А пісаў з душою. Працаваў тады Віктар у газеце "Чырвоны Кастрычнік" у Акцябрскім раёне, і паэма была апублікавана там. Нядаўна яе знайшлі ў архіве паэта.

1

Якаў Падута нарадзіўся ў 1903 годзе ў вёсцы Вежын Рудабельскай воласці. Іх, дзяцей, у бацькі было пяцёра. Жылі, як і ўсе сяляне спарахнелай расійскай імперыі. Здаралася, за дзень лустачкі хлеба не каштавалі. Якаў Рыгоравіч добра запомніў графа Іванецку, які панаваў на іх землях, яго зяця, барона Урангеля. Бачыў іх "ягамосьці" на ўласныя вочы. Шмат давялося перажыць вежынцу. Яго споведзь у наступных радках, якія аўтар запісаў яшчэ ў сярэдзіне 80-ых гадоў мінулага стагоддзя.

В. Стрыжак, У. Марук і А. Пісьмянкоў, 1977 г.

— Жыццё цвіло не спешчанай,
А бляклай, кволай кветкаю...
І панскай Рудабельшчыны —
Маё дзяцінства сведкаю.

Гарбела доля рабская,
А над спіной сялянскаю
Гуляла пуга графская
З баронскай "ласкаю"...

Спазнаў і кожны з вежынцаў
Адзнакі царскай вольнасці:
Хоць ты ідзі у бежанцы
З забытай Богам воласці...

Глядзелі ў леты з зімамі
Галечы вочы хмельныя...
Зямля, што зваў Радзімаю,
Марнела беззямельнаю.

Смяяўся лёс над вечнымі
Мужыцкімі надзеямі...
Эх, абразы са свечкамі,
І крыжыкі нацельныя!..

Звязаўся б з сілай чортавай
Ці шчэ з якою трасцаю,
Каб вызваліцца з чорнага,
Ад ганьбы адкараскацца.

Была б навука брамаю
І шляхам з безвыходнасці.
Ды дзе схавана грамата
У краі скутай годнасці?..

Хоць і хадзіў у земскую,
А быццам і няходжана:
Скідала ява сельская
З каня навукі кожнага.

Малога і дарослага.
Жыві сляпым да старасці.
І зарастай каростаю
Сваёй адсталасці...

У жылах гнеў настойваўся
Сялян і вечных парабкаў...
А да святла настойліва
Цягнуўся праўды парастак...

Тады мы мала верылі
У здольнасць Бога кволую,
Свет да сябе прымервалі
І кожны трызніў воляю...

У кожнай хаце Вежына,
Гарбатай і пракуранай,
Чакалі ветру свежага
І подыху віхурнага...

Ды голасу магутнага,
Ды слова паваротнага
Чакалі шматпакутныя
Мясціны нашы родныя.

2

У 1917 годзе быў падлеткам і ўжо не сачыў за падзеямі пабочным назіральнікам, а імкнуўся стаць упоравень з часам.

— Пакуль яшчэ без выбрыкаў
Мне служыць памяць продкава.
На час і зараз выбрыла,
Ў якім жыццё кароткае

Было мне напрарочана...
Ішоў мне год пятнаццаты.
Калі па свеце крочыла
Свабоды каранацыя...

Свабода — кветка гордая.
І не цвіце у кволасці.
І мы сцягі разгортвалі
Сваёй чырвонай воласці...

Сказаць, што мы адплатаю
Былі тады сагрэтыя,
То не, — сваёй уладаю
І першымі Дэкрэтамі.

І тым, што ўсё настойлівей
Нас будучыня клікала
Ісці усім у дойліды
Супольніцтва вялікага.

Нішто не забаронена,
І насцеж дзверы дзеянню...
Была зямля баронава
Паміж сялян падзелена.

Зямелька бесславесная,
І ведаць ты не ведала,
Якая ноч злавесная
Гусцела над камбедамі...

І каб не дацца ворагу,
Ярму, што так намуляла,
У нас атрад быў створаны
Калішнімі "хамуламі".

Зрабіўся ён асноваю
Ўсяго жыцця далейшага:
Складанага і новага,
Ды, безумоўна, лепшага.

Пад партызанскай дратваю
Спачатку кайзер-субчыкі
З ваколіц нашых драпалі,
А потым і пілсудчыкі.

Пасля і іншым высметкам
Пароды чалавечае
Тут надавалі выспеткаў,
І свечак не засвечвалі.

Не шмат я разумеў тады.
Але жыла рамантыка,
Жыццё кавала метады
Вучыць яго граматыку...

Не спалі ў шапку гойныя
Мае лясныя вежынцы...
Пасля глядзелі з гонарам,
Як іх жа справа вежыцца.

І нават хаты стройнымі
Здаваліся і ветлымі,
Бо сілы ўсім патройвала
Зара свабоды светлая.

Але ж каса не клеплецца,
Нібыта намі грэбуе,
Калі жывеш бясхлебіцай
І галасуеш рэбрамі...

Надзеі падламаныя...
Ды спадчына пахілая...
Ад тыфу тата з мамаю
Зрабіліся магіламі.

Тады нанесла вырастаў
На цела вёскі кволае...
І сам бы ногі выпрастаў,
Ды людзі не дазволілі.

Надзей маіх акрыленых
Міргалі мне равесніцы,
Што ўгледзеў
між кадрылямі
Свайго кахання весніцы.

Былі яны адчынены
Ад раніцы да раніцы
Суседскаю дзяўчынаю —
Маёй абранніцай.

Цвілі нам дні салютамі
І песнямі мажорнымі,
Калі з маёй Улютаю
Мы сталі мужам-жонкаю...

І чацвярыма дзеткамі
Цвілі нам дні з Улютаю...
Ды перад днямі-здзекамі,
Перад вайною лютаю...

3

Ад першага да апошняга дня блакады Ленінграда Якаў Рыгоравіч змагаецца ў шарэнгах яго абаронцаў. Удзельнічае ў вызваленні Літвы, Эстоніі, у шпіталях чакае вяртання ў строй пасля пяці раненняў і не ведае, што самае страшнае абрынецца на яго пасля Перамогі...

— Мой век гарэў паходняміі
Гаротных дзён і радасных.
А ці было пагодліва?
Часцей зашкальваў
градуснік...

І пахла апраметнаю,
І людзі расшалопвалі,
Што недзе трубы медныя
Вядуць па іх жалобнае...

І што не дзеці гупаюць,
А цмок вайны
над хатамі
Пачаў пладзіцца гукамі
Бяды і страху гадамі...

Вайна спрадвеку клятая
Жыццём людзей знявечаных
Штовек кляймо
накладвала
На душы чалавечыя.

І я вайной не мінуты.
І я з вайною змешаны...
Быў мною дом пакінуты
З сям'ёй у Вежыне,

Калі, як рэха, радыё
На слых нас выпрабоўвала,
І мір быў зноў пакратаны,
І Мінск палаў пад бомбамі.

Мне не забыць на першыя
Гадзіны, дні і месяцы,
На тыя, што ў цяперашніх
Старэчых снах не месцяцца...

Але часцей прыгадваю
Не раны з адступленнямі,
А сухары блакадныя
Пад Ленінграда сценамі.

Я гэты горад выстагнаў.
І, як і ён, паранены
Усю блакаду выстаяў.
Законна. Горда. Правільна.

А Вежын як? А дома што?
За ўсю вайну ні вестачкі...
Нудзіўся невядомасцю
І сніў кахання веснічкі...

Улюта, дзеткі, вежынцы,
Мясціны нашы родныя...
Няўжо стажок завершыцца
Майго жыцця гаротнага?..

Ды зноў шпіталь. Параніла
У пяты раз пад Рыгаю.
І ледзь не кожнай раніцай
Дамоў пяро парыпвала...

Як я свяціўся радасцю,
Нібы расою вымыты,
Калі пачуў па радыё,
Што з краю немцаў вымелі...

Але ні слова з Вежына.
На крык душы —
ні водгуку.
Нібыта свет завешаны
Тугім свінцовым воблакам...

4

Да самай Перамогі не ведаў салдат, што яшчэ ў сакавіку 1942 года не стала яго роднай вёскі — яна была знішчана фашысцкімі захопнікамі. Жывымі ў хляве цесця Якава Падуты спалена 70 жыхароў Вежына. У тым агні згарэлі дзеці абаронцы Ленінграда — Жэня, Валя, Марыя, Віця, яго жонка Улюта...

Хіба я думаў, марачы
Аб ніве жыта спелага,
Што лёс мой
так захмарыцца —
Не ўбачыш свету белага?

Ці думаў пра гаротнае,
Заняты вольнай працаю?
Ці сніў, што поле роднае
Магілай стане брацкаю?..

Калі было так хораша
Перад дзіцём народжаным,
Ці ведаў я аб горычы,
Што да мяне пакрочыла?..

Жыве журба бясконцая...
Да дробнай бачу рысачкі
Сваю сям'ю з вяскоўцамі
У кожным прысаку...

І чую голас: "Выратуй!"...
І чую крыкі: "Вызвалі!"...
Ну, хто дазволіў вырадку
Нутро над намі вызверыць?..

Што зведаць давялося мне,
Ужо слязой не вылецца.
Шуміць зямля калоссямі...
Брыдзе душа на мыліцах...

Шмат гора і пакут вытрываў Якаў Рыгоравіч. Але не зламаўся салдат-блакаднік, не скарыўся перад абставінамі. Спаткалася на яго шляху жанчына, якая ўмела разумець і кахаць — Ефрасіння Яўсееўна. Нарадзілі і выправілі ў жыццё пяцярых дзяцей...

Публікацыя
Валянціны СТРЫЖАК

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва" смуткуе з выпадку смерці пісьменніка, перакладчыка Алеся Пятровіча Траяноўскага. Выказваем спачуванне яго родным і блізкім.

Габрыэла МІСТРАЛЬ:

"Крыві маёй згусткамі корміцца верш мой,
як сын адзіны,
дзе сын яшчэ ёсць, каб крыві столькі выпіў
з грудзей жанчыны."

Ніна МАЦЯШ. "Богава дрэва" (вершы; Мінск, "Про Хрысто", 2004, рэдактар К.Лялько, 500 ас., 68 стар.)

Ніна Мацяш — паэтка, вядомая сваёй арыгінальнай паэтычнай творчасцю і складаным чалавечым лёсам. На мой погляд, для жанчыны пражыць такое жыццё, *ствараючы іншае*, калі не гераічны ўчынак, то ва ўсякім разе — доля надзвычайная...

Як піша яна ў афарыстычным трохрадкоўі "Схованка":

Паэту ў часу
жорсткіх ловах
ёсць прывідны
ратунак:
слова.

Здавалася б, а чаму б ёй і самой не схавацца ад ловаў цяперашняга жыцця ў глыбокіх тайніцах сваёй душы; забіцца непрыручанай птушкай у гняздзе сваёй адзіноты і самотна дзяўбсці па каліву ўежнае зерне гэтага неміласэрнага часу?.. Але не, Ніна Мацяш — чалавек самадастатковы і насуперак сваёй нядолі нават самаахвярны. Яна дзеліцца *сваім* высока духоўным з *чужым* фізічна моцным. Нічога не патрабуючы ўзамен. Яна ведае, што

Гасподзь схіляецца да ўсіх,
ды
духам ніцых
Ён не чуе.

Але тады, хто ж іх пачуе?! І калі — не, то, значыць, светам так і будуць кіраваць Зло і Сіла... Ці ўсё-ткі чалавек гатовы не толькі паўставаць супраць іх, але і пайсці насустрач ім,

Бо годны вызначаны шлях,
і ланцугі сарваны з духу,
і рух разгортвае абсяг
бязмежжа
за вяршыняй скрухі...

Чалавечы аптымізм і творчыя пакуты нераздзельныя. Там, дзе, пераплаўленая ў горне жарсці і нязбытных кроз, выспельваецца надзея на спаконвечнае жыццё — ад продкаў да нашчадкаў, зачынаецца і *Найвышэйшая песня* — Паэзія. Мабыць, будзе перабольшваннем, калі я скажу, што і гэты чарговы зборнічак Ніны Мацяш, выдадзены з Божай ласкі выдавецтвам "Про Хрысто", выяўляе нейкі новы і нязнаны бок яе паэтычнай творчасці. Пэўней будзе зазначыць, што ён дапаўняе і пацвярджае ўжо раней акрэсленую мяжу яе мастацкіх мажлівасцяў. Абсяг гэты даволі шырокі і размаіты. Божы дар не траціўся дарма. А калі яшчэ ўлічыць перакладчыцкую дзейнасць выбітнай паэткі, то наўрад ці можа яна недаволіцца творчым плёнам душы сваёй.

"Дзеля чаго Ты, Божа,
з неба звёў мяне ў бездарожжа?
Каб за прывідам тузалася,
і плакала, і спявала,
слёзы словам сваім
сама сабе выцірала?

Гэта якраз з упомненых творчых пакутаў. А вось гэта — са спрадвечных свядомасных напластаванняў чалавечага аптымізму:

Божа,
Ты й дзеля мяне расхінуў белы свет:
дзякуй!
Вось, расхінаюся й я
прад Табою,
растапляюся —
да самстраты,
да страты ўласнае самсці зямной...

Паклон, Ніна. Твары і дзейсні...

Людміла НАЎЛІКАВА-ХЕЙДАРАВА. "Плач па анёлу" (кніга паэзіі; Мінск, Логвінаў, 2004, рэдактар У.Сіўчыкаў, 100 ас., 208 стар.)

Яшчэ ў 1985 годзе я станоўча адрэцэнзаваў першы зборнік Л.Паўлікавай "Адведзіны рамонкавай паляны", за што неўзабаве атрымаў адлуп ад большасці крытыкаў: маўляў, у адным і тым жа нумары "ЛіМа" шараговы зборнічак Л.Паўлікавай атрымаў станоўчы водгук Л.Галубовіча, тады як неардынарная выбітная кніжка А.Мінкіна "Сурма" займела ад суровага крытыка А.Сідарэвіча шмат крытычных папрокаў. Адным словам, не так тады перапала аўтару, як правінцыйнаму на той час рэцэнзенту яе зборніка. Сёння і Л.Паўлікава і А.Мінкін рэдкія госці на старонках нашых літаратурна-мастацкіх выданняў. Што ж, такі значыць іх паэтычны вырак. І напраўду, папярэдні зборнік Л.Паўлікавай "Купанне ў росах" (1993) ад гэтага ("Плач па анёлу") аддзяляе больш за дзесяць гадоў. Цікава было б прасачыць эвалюцыю творчасці паэткі. Але наўрад ці тое магчыма, паколькі нейкіх асаблівых, тым больш неардынарных зменаў мастацкай парадыгмы ў яе творах не адчуваецца. Да прыкладу, папярэдняя кніжка Л.Паўлікавай заканчвалася своеасаблівым анонсам — раздзелам "Прадчуванне новай кнігі", той, з якой я вас і знаёмлю. Там быў і гэты ёмкі адметны верш:

Каб падтрымаць агонь,
я аддала яму ўсё...
Я не знала,
што гэта завецца ахвярай,
якую прыняў ён,
каб падтрымаць мяне...

Шматабяцальная запеўка. Меркавалася, што паэтка адкрые нейкія новыя, раней недаследаваныя ёй гарызонты чалавечага духу. Ахвяруючы нечым асабіста важным (*праявамі ўласнага зямнога жыцця*), яна павінна была ўзамен (*праз агонь*) адрадзіцца, як птушка Фенікс, і выявіць прыхільнікам свайго таленту новыя творчыя здзяйсненні (*учынак Праметэя*). Зачын зборніка "Плач па анёлу" раней заяўленыя намеры як бы сцвярджае:

Паэт — ігрок... Смялей, чытач,
на коне — блеф, што ты гартаеш.
Прабач за шчырасць — не святая.
Прабач за зман. Яшчэ прабач,
што сею смутак і трывогу.
Той адпявае — хто пяе.
Калі паэзія — ад Бога,
зямныя — словы ўсе яе...

Любоў — галоўная тэма зборніка. Любоў ва ўсіх яе праявах. Любоў біблейская і хрысціянская. І тут у паэткі найбольшыя ўдачы. Мне падаецца, што ўласны жаночы вопыт "выношвання" гэтай любові адыграў у творчым працэсе Л.Паўлікавай галоўную ролю. Бо, не натаміўшы ўласнае цела і не натрудзіўшы сваёй душы, не спазнаеш сутнасці спрадвечнага пожаду жыцця, не адчуеш водгуку сваёй любові ў іншых:

Сустрэліся аднойчы у жыцці
два лёсы з тварамі, што хмарамі.
Не перуны, не бліскавіцы
ірвалі неба долі ніцай,
а проста, перш чым парадніцца
два сэрцы мераліся ўдарамі.

Цудоўны верш. Альбо вось гэты — відавочна адчувальны:

Зайшоў па дарозе ў ноч
няголены, злы, калючы,
старожкі, што крок над кручай,
вечар стамлёных воч,
вуснаў, што пахлі дымам...
...Дзякую, што не міма.

Аднак здараюцца на такім высокім уздыме і зрывы. Раптам — у адным вершы — могуць апынуцца побач неадэкватныя ў мастацкім выкананні радкі. Вось два з іх:

...і як ніхто ў душу табе не плюнуў,
магчыма, не было ва што пляваць —

якія нічога, апроч недаўмення і вульгарнай аскоміны ў чытача не выклікаюць. А наступныя, спадарожныя ім, вартыя ўвагі:

Прыроду чалавека нам не ўдаць,
бо колькі б у жыцці сябрам не даў ты,
калі цябе ніводзін не прадаў з іх,
падумай — ці было што прадаваць?

Сустракаюцца праявы аўтарскай глухаты і слепаты і ў некаторых іншых вершах. Прывяду некалькі прыкладаў: *"...як на Зямлі душа знаходзіць мір,// часоў няма — ёсць міг* **перакшталчэння***", "Помніш тугу па жанчыне з кургана?// ...***Белая сківіца***... Медныя косы...", "З каленек долу скочыў наш сабака,// Цяпер нічый,* **ужо** *нічый* **яшчэ***", "...Як трэба асцярожна// З прахожым* **разміноўвацца** *падчас!", "У вечнасці, напэўна, свой разлік.// Душа мая, не станавіся ў позу!// Не прымушай мяне адводзіць позірк —// ёсць і ў крывым люстэрку мой* **ваблік***."*

Але ёсць і адваротныя выпадкі, калі *новатвор*, як кажуць, пасуе: *"Замкні былое з прышласцю ў вянец,// не спачывай на лаўрах, як у марах,// усё святое — нам даецца дарам,// ды ўзяць той дар не кожны з нас* **умец***."*

Умец — як умелец і адначасна разумны (*"ушлы"*). (Выдзяленні мае — **ЛеГАЛ.**)

Агулам знаходкі і творчыя ўдачы ў зборніку пераважаюць.

Ёсць савецкі фільм з запамінальным назовам: *"Палёты ў сне і наяве"*, які вельмі трапна характарызуе творчае і жыццёвае *крэда* паэткі Л.Паўлікавай. Яна — натура адважная і рызыкоўная не толькі ў паэзіі, бо не раз і не два натуральна ўздымалася ў неба, лётаючы на дэльтаплане... намагаючыся ўзвысіцца да сваіх мрояў — узвышалася і ...разбівалася... І ўсё ж балючыя падзенні не "выбілі яе з сядла". Адчуванне палёту не пакідае паэтку і сёння. Гэта дае падставу спадзявацца на яе далейшае творчае *ўзнясенне*. Як піша Л.Паўлікава ў магістральным санеце "Вянок Задыяка":

Мой светлы друг, пакінем забыццё,
свабодай вызначай напрамак руху,
ганец глыбінь да высяў, воін духу,
ты сам — ёсць шлях,
а сэнс жыцця —Жыццё.

Як не пагадзіцца з такой высновай.

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА І ПАЎГОДДЗЕ 2005 ГОДА!

«Літаратура і мастацтва»
Індывідуальная (індэкс — 63856)
на 1 месяц — 3500 руб.
на 3 месяцы — 10500 руб.
Ведамасная (індэкс — 638562)
на 1 месяц — 4800 руб.
на 3 месяцы — 14400 руб.
Льготная (індэкс — 63880)
на 1 месяц — 3800 руб.
на 6 месяцаў — 22800 руб.

"Маладосць"
Індывідуальная (індэкс — 74957)
на 1 месяц — 3300 руб.
на 3 месяцы — 9900 руб.
Ведамасная (індэкс — 749572)
на 1 месяц — 4500 руб.
на 3 месяцы — 13500 руб.
Льготная (індэкс — 00731)
на 1 месяц — 3500 руб.
на 6 месяцаў — 21000 руб.

"Полымя"
Індывідуальная (індэкс — 74985)
на 1 месяц — 3200 руб.
на 3 месяцы — 9600 руб.
Ведамасная (індэкс — 749852)
на 1 месяц — 4200 руб.
на 3 месяцы — 12600 руб.
Льготная (індэкс — 00727)
на 1 месяц — 3500 руб.
на 6 месяцаў — 21000 руб.

"Всемирная литература"
Індывідуальная (індэкс — 74863)
на 2 месяцы — 3500 руб.
на 4 месяцы — 7000 руб.
Ведамасная (індэкс — 748632)
на 2 месяцы — 4500 руб.
на 4 месяцы — 9000 руб.
Льготная (індэкс — 00729)
на 2 месяцы — 3800 руб.
на 6 месяцаў — 11400 руб.

"Нёман"
Індывідуальная (індэкс — 74968)
на 1 месяц — 3200 руб.
на 3 месяцы — 9600 руб.
Ведамасная (індэкс — 749682)
на 3 месяцы — 12600 руб.
Льготная (індэкс — 00728)
на 1 месяц — 3500 руб.
на 6 месяцаў — 21000 руб.

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе
ўзнагароджаны ордэнам
Дружбы народаў

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
Віктар КАВАЛЁЎ,
Янка ЛАЙКОЎ,
Ірына ШАЎЛЯКОВА,
Наталля ЯКАВЕНКА

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск,
вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
галоўны
рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага
рэдактара — 284-66-73

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай
думкі — 284-81-53
паэзіі, літаратурнага жыцця,
крытыкі
і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы — 284-66-73
музыкі, тэатра, кіно
і выяўленчага
мастацтва — 284-81-53
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

Электронны адрас:
e-mail: minsk@lim.by

Адрас у Інтэрнеце —
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ". Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Ф. Скарыны, 79

Індэкс 63856. Наклад 3036
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 6.04.2005 у 11.00

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 390

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12